№ 178 (1741)

Пятніца, 19 верасня 2003 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах

Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Выдавец: УП «Народная воля».

Кошт свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +21...+23, уначы — +13...+15; у Брэсце ўдзень — +21...+23, уначы — +14...+16; у Гродне ўдзень — +21...+23, уначы — +14...+16; у Віцебску ўдзень — +18...+20, уначы — +13...+15; у Гомелі ўдзень — +18...+20, уначы — +11...+13; у Магілёве ўдзень — +19...+21, уначы — +12...+14.

Па ўсёй тэрыторыі — сонечна, без ападкаў.

www.meteo.by

ПУЛЬС

Ярашуку — 10 сутак! За што?

Учора адбыўся суд над лідэрам Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) **Аляксандрам ЯРАШУКОМ.**

Падставай для абвінавачвання стаў артыкул Ярашука "Пірава перамога, або Хроніка пікіруючага прафсаюза", які быў апублікаваны ў нашай газеце 21 жніўня. У ім гаварылася аб ліквідацыі Беларускага прафсаюза авіядыспетчараў. Аўтар артыкула выказаў сваё меркаванне, што пасяджэнні Вярхоўнага суда па справе прафсаюза авіядыспетчараў былі *"спектаклем з загадзя вядомым канцом"*.

Пытанне аб адказнасці Ярашука ўзбудзіла пракуратура Рэспублікі Беларусь. У суд Ленінскага раёна Мінска, дзе праходзіла судовае пасяджэнне, падтрымаць Ярашука прыйшлі актывісты прафсаюзнага руху, яго блізкія, усяго каля 30 чалавек. Аднак у цесны кабінет суддзі дазволілі зайсці толькі чатыром чалавекам. Большай залы суд не прадаставіў. За паўгадзіны суддзёй Аляксандрам Шылько было вынесена рашэнне — 10 сутак адміністрацыйнага арышту.

Аляксандр Ярашук заявіў, што *"рашэнне суда — не што іншае, як выкананне палітычнага заказу"*.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Хабар, як сродак выжывання?

Міжраённая пракуратура распачала крымінальную справу ў дачыненні да начальніка ваенна-ўліковага стала Зажэвіцкага сельскага савета Салігорскага раёна Галіны Сляпцовай. Яна падазраецца ў атрыманні 12 верасня хабару ў суме 120 долараў ЗША ў сваім службовым кабінеце ад грамадзяніна Расіі, якога незаконна прапісала ў вёсцы Зажэвічы.

Як паведаміў БелаПАН старшы следчы пракуратуры Аляксандр Панамароў, устаноўлена, што Г.Сляпцова неаднаразова афармляла незаконную прапіску грамадзянам, па сутнасці, паставіла гэты бізнес "на паток".

Сама падазроная ў першых паказаннях прызналася, сказаўшы, што ўзяць грошы ад грамадзяніна Расіі яе прымусіла цяжкае матэрыяльнае становішча.

У выпадку, калі ў судзе будзе даказана яе віна, жанчыне пагражае тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў пазбаўлення волі.

Ларыса НАСАНОВІЧ.

Курсы замежных валют на 19 верасня

На 19 верасня Нацыянальны банк Беларусі ўстанавіў наступныя афіцыйныя курсы замежных валют:

1 долар ЗША — 2103,00 рублі
1 еўра — 2358,20
1 расійскі рубель — 68,75
1 аўстралійскі долар — 1395,24
1 балгарскі леў — 1211,34
1 дацкая крона — 317,45
1 СДР — 2874,23
1 ісландская крона — 26,42
10 японскіх іен — 180,73
1 казахскі тэнге — 14,26
1 канадскі долар — 1537,06
1 кувейцкі дынар — 7068,91
1 кыргызскі сом — 49,78
1 латвійскі лат — 3685,92
1 літоўскі літ — 682,88
1 малдаўскі лей — 157,00
1 нарвежская крона — 285,28
1 польскі злоты — 521,58
1 сінгапурскі долар — 1200,96
10000 турэцкіх лір — 15,30
1 украінская грыўна — 394,33
1 англійскі фунт стэрлінгаў — 3365,22
1 чэшская крона — 72,08
1 шведская крона — 259,77
1 швейцарскі франк — 1521,82
1 эстонская крона — 150,71

Чем не угодил охране рабочий?

Профсоюзный активист, поэт, рабочий Гродненского завода автоагрегатов ***Иван Роман*** *подвергается репрессиям*

Жалобу в прокуратуру на действия администрации и охраны Гродненского завода автоагрегатов, которые дважды инициировали его задержание и досмотр, подал рабочий завода, профсоюзный активист Иван Роман. В четверг 11 сентября, в 7 часов утра, охранники задержали его на проходной завода, когда он шел на смену. Его препроводили в комнату для досмотров и попытались обыскать, даже не объяснив, что именно они ищут.

Рабочий потребовал от охранников вызова понятых и оформления протокола досмотра. Тогда охрана вызвала наряд милиции из близлежащего опорного пункта "Девятовка". Романа отвезли в помещение дежурной части и там досмотрели его, не составляя протокола. Ничего не найдя и извинившись, сотрудники милиции отпустили его на работу. Все это длилось около часа.

На следующее утро Роман вновь был задержан охраной завода. Он имел при себе папку с экземпляром газеты "Рабочая солидарность", бюллетенями профсоюза АСМ и копией своего заявления в прокуратуру, которое он подал еще в четверг после первого задержания. Охранники сообщили ему, что, согласно приказу директора Можджера, на территорию завода запрещено проносить печатную продукцию, и вызвали милицию. В отделении его вновь обыскали и вновь, не найдя ничего, извинились.

— Администрация завода пытается меня запугать, но я намерен бороться до конца за гражданские и трудовые права, — сказал Иван Роман.

Иван Роман известен на заводе как активист профсоюзного движения. В заявлении в прокуратуру он указал, что эти досмотры, как он считает, инициированы администрацией предприятия, которая мстит ему за его активность в отстаивании трудовых прав. Так, недавно именно по инициативе Ивана Романа правовая инспекция по труду профсоюза АСМ вынесла представление об отмене нескольких приказов директора завода автоагрегатов как нарушающих трудовое законодательство.

Теперь прокуратура будет обязана рассмотреть не только незаконный досмотр Романа, но и причины, по которым администрация не исполняет представление инспекции по труду. Известно, что сотрудник прокуратуры уже взял письменное объяснение у начальника охраны завода. Тот сослался на анонимные телефонные звонки о том, что Роман собирается внести на завод листовки.

Ирина ЧЕРНЯВКА.



Пасцялі на падлогу ... мару

У Мінску адкрылася выстава іранскіх тавараў, у тым ліку сапраўдных персідскіх дываноў

Другая нацыянальная выстава "Іран прадстаўляе", арганізаваная іранскай кампаніяй "Б@Б Інтэрнешнл", Амбасадай Ісламскай Рэспублікі Іран у Беларусі і Беларускай гандлёва-прамысловай палатай, працуе з учарашнята дня ў будынку былога ВДНГ на Я.Купалы, 27 у Мінску. Выстава працягнецца да 25 верасня. Сярод тавараў — персідскія дываны, мэблевыя гарнітуры, вырабы са скуры і шоўка, кераміка і г.д.

На адкрыцці выставы, якое адбылося ўчора, 18 верасня, прысутнічалі міністры гандлю Ірана і Беларусі — Махамад Шарыятмадары і Аляксандр Кулічкоў, міністр культуры Беларусі Леанід Гуляка і пасол Ірана ў нашай краіне сп. Гальпайгані. У выставе, згодна са словамі Аляксандра Кулічкова, ўдзельнічаюць больш за 20 іранскіх прадпрыемстваў. Таксама было паведамлена, што тавараабарот паміж Беларуссю і Іранам за сем месяцаў бягучага года склаў 13,8 мільёнаў долараў, што на 48 працэнтаў больш за аналагічны леташні паказчык. Згодна з планамі арганізатараў выставы, з яе дапамогай гэта лічба будзе значна павышана.

Іранская выстава прыцягнула даволі шмат людзей, але ў першы дзень набыць што-небудзь з тавараў было практычна немагчыма — кошты на прадукцыю абяцалі выставіць толькі сёння, 19 верасня.

Дарэчы, сапраўдны персідскі дыван, набыты на Я.Купалы, 27, як мне паведаміў адзін з прадстаўнікоў іранскага боку, будзе каштаваць не так і дорага — 100—150 долараў. Вялікі ж дыван ручной работы абыдзецца значна даражэй — больш за 1000 амерыканскіх "рублёў", і зацікавяцца ім, відаць, толькі "новыя беларусы".

Алесь СІЛІЧ.
Фота аўтара.

На здымку: *міністры гандлю Беларусі і Ірана адкрываюць выставу.*

На «и» начинается, повсеместно внедряется

"Средства массовой информации сегодня — это прежде всего инструмент проведения в жизнь государственной идеологии, и деятельность свою они должны строить с учетом этой функции", — так Александр Лукашенко охарактеризовал роль и функцию СМИ в белорусском обществе. Об этом он сказал не так давно во время встречи с заместителем главы Администрации президента Олегом Пролесковским и председателем Национальной государственной телерадиокомпании Егором Рыбаковым.

Сергей ПУЛЬША

В общем, идея главы государства отнюдь не нова. Владимир Ленин, к примеру, говаривал, что газета — это не только коллективный пропагандист и агитатор, но и коллективный организатор. А то, что она по определению прежде всего "информатор", как-то упускалось из виду. Вероятно, поэтому в Советском Союзе даже аббревиатуры "СМИ" не было. Тогда это называлось "СМАП" — средства массовой агитации и пропаганды. Теперь белорусский руководитель провозглашает, что электронная и печатная пресса — это "инструмент" для каких-то целей, а не зеркало жизни общества. То есть СМИ снова должны превратиться в СМАП. Добро пожаловать в СССР!!!

"И флаг им в руки!" — такими словами президент общественного объединения "Белорусская ассоциация журналистов" **Жанна Литвина** приветствовала стремление белорусской власти сделать из СМИ белорусские СМАП.

— По большому счету, советская пропаганда работала против Советского Союза, давала обратный эффект. Люди знали, что если пропаганда утверждала одно — значит, на самом деле все с точностью до наоборот. И это неприятие навязчивой государственной пропаганды в Беларуси проявилось на выборах 1994 года, когда агитационно-пропагандистская машина премьера Кебича сделала против него больше, чем вся оппозиция вместе взятая. Я надеюсь, что усиление государственной идеологии сейчас будет иметь такой же результат.

Между тем инструмент далек от блеска. Тиражи государственных газет продолжают падать. Этим озаботился даже президент. На упомянутой встрече Александр Лукашенко *"указал на существенные недостатки в работе ряда как центральных, так и областных печатных изданий, которые, по словам главы государства, чересчур увлеклись описанием бесконечных заседаний и совещаний, оторвались от реальной жизни своего региона и перестали в итоге интересовать простого читателя. Следствием этого стало падение их тиражей"*, — сообщила пресс-служба президента.

Вот это-то и есть самое интересное. Казалось бы, чего еще: ведь государственным изданиям — как в столице, так и в регионах — создан режим наибольшего благоприятствования. Расценки на печать и распространение ниже, чем для негосударственных редакций, дотации из бюджета поступают, налоговые и прочие проверки не терзают, аренда помещения, как правило, бесплатна — работай не хочу! Тем не менее тиражи продолжают катиться вниз. А теперь от подчиненных "вертикали" редакций все настоятельнее требуют "проведения в жизнь государственной идеологии", которой, во-первых, еще нет (а иначе **зачем бы на сайте президента открывать дискуссию** по ее поводу) и к которой, во-вторых, в обществе априори относятся весьма неоднозначно.

Газета должна информировать, анализировать и развлекать — именно этот принцип считается "формулой успеха" СМИ. Газета должна быть интересной. Можно ли сделать интересной газетную версию государственной идеологии?

Редактор приостановленной газеты "Салідарнасць" **Александр Старикевич** считает, что идеологию можно сделать интересной, но это зависит прежде всего от кадров. А кадров нет.

— В принципе, идеология может подаваться интересно и эффективно. Но у государственной прессы, при всех в нее вливаниях, чрезвычайно низкий КПД. И я не думаю, что совещания у президента изменят эту картину. Читателю предлагают все то же — коктейль из пропаганды и таблоида. Это при практически неограниченных вложениях! Дело в том, что недостаточно именно творческих ресурсов, новые кадры взять неоткуда.

— Но вы же в свое время сумели сделать из скучного профсоюзного "Беларускага часу" интересную газету...

— Мне никто не ставил задачу проводить в жизнь государственную идеологию. Поэтому удалось собрать новый коллектив и что-то сделать. Но это было далеко от идеала — в основном потому, что нам Федерация профсоюзов как учредитель материально практически не помогала. Подвижки в газетном деле требуют денег. Но кроме денег они требуют еще и мозгов. А наши теперешние пропагандисты в основном интеллектуально экономны.

Вполне возможно, кто-то из умных людей в Администрации президента и додумается до интересной подачи идеологического материала. Например, идеология в комиксах, кроссвордах или шарадах. И тогда все, кто любит разные головоломки, будут хорошо знать основы государственной идеологии. Ну-ка, пошевелите мозговой извилиной: **на "и" начинается, повсеместно внедряется...**

19 сентября — ДЕНЬ ЗАКРЫТЫХ ГАЗЕТ

БДГ. Для служебного пользования
Беларуская маладзёжная
Голас Пружаны
Куцейна
Местное время
Навіны
Наша свабода
Пагоня
Предпринимательская газета
Провинциалка
Рабочы
Свабода
Свободные новости
Тыднёвік магілёўскі
Фемида
Эхо

20 независимых газет уже НЕТ

ГДЕ УЗНАТЬ ПРАВДУ?

СКАНДАЛ

Мінюст можа ліквідаваць ЛДП

Міністэрства юстыцыі Беларусі заяўляе аб юрыдычнай неграунтоўнасці Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП).

Падставай для такой высновы, зазначаецца ў паведамленні Мінюста, сталі грубае парушэнне ЛДП уласнага статута, паўторнае прадастаўленне партыяй недакладнай інфармацыі ў рэгіструючы орган, выказванне недаверу кіраўніку партыі з боку значнай часткі дэлегатаў восьмага з'езда партыі і членаў Вышэйшага савета партыі, а таксама здача кіраўніцтвам партыі ў Мінюст пасведчання аб рэгістрацыі партыі і яе пячаткі.

Мінюст прапаноўвае ЛДП у трохмесячны тэрмін пацвердзіць колькасны склад партыі, устрымацца ад правядзення з'ездаў, партыйных сходаў, мітынгаў, дэманстрацый і пікетаванняў, не ствараць любога выгляду блокі і саюзы з іншымі партыямі, устрымацца ад кантактаў і сувязяў з іншымі партыямі і грамадскімі аб'яднаннямі як унутры Беларусі, гэтак і за мяжой.

Мінюст таксама заклікае кіраўніцтва партыі праводзіць ва ўнутрыпартыйным жыцці "прынцыпы дэмакратызму і законнасці, як таго патрабуе статут ЛДП". У адваротным выпадку Мінюст прыступіць да працэдуры ліквідацыі партыі.

Сяргей Гайдукевіч у інтэрв'ю БелаПАН заявіў, што сваім паведамленнем Мінюст пацвердзіў яго паўнамоцтвы як старшыні партыі. "У заяве ёсць спасылка на неабходнасць кіравацца статутам партыі і нічога не гаворыцца аб выніках з'езда. А па дзеючым статуце я з'яўляюся старшынёй партыі", — сказаў палітык. На яго думку, ЛДП хопіць тры месяцы для таго, каб выканаць умовы Мінюста і захаваць партыю.

Член Вышэйшага савета Алег Маркевіч заявіў, што супрацьстаячы бок гатовы сесці за стол перамоў, як толькі Сяргей Гайдукевіч забярэ з Мінюста пячатку і пасведчанне аб рэгістрацыі партыі. "Партыя нам дарагая, і мы хацелі б яе захаваць", — сказаў ён БелаПАН.

Юрый ПАЦЁМКІН.

КОММЕНТАРИЙ ЮРИСТОВ

«Суд присяжных» вынес вердикт: отменить!

Ровно год назад общественное объединение "Белорусская ассоциация журналистов" выступило с инициативой сбора подписей граждан Республики Беларусь за отмену статей 367, 368 и 369 Уголовного кодекса, предусматривающих ответственность за клевету и оскорбление президента Республики Беларусь, а также за оскорбление представителя власти. Основной причиной начала этой общенациональной кампании стали уголовные дела в отношении журналистов гродненской газеты "Пагоня" Николая Маркевича и Павла Можейко.

К сбору подписей активно подключились редакции независимых газет, в том числе "Народная воля", ряд политических партий и общественных организаций, а также неравнодушные граждане. В течение нескольких ближайших месяцев после начала кампании было собрано около 7 тысяч подписей.

Акция белорусских журналистов привлекла внимание международной общественности. Ее поддержали и депутаты Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь — члены группы "Республика". Они предприняли попытку включить в повестку дня очередной сессии вопрос об отмене вышеуказанных статей. К сожалению, большинством голосов этот вопрос был блокирован и потому не стал предметом обсуждения в парламенте.

На съезде общественного объединения "Белорусская ассоциация журналистов" было принято решение обратиться в Конституционный суд с запросом о соответствии Конституции статей 367—369 Уголовного кодекса. 2 июля 2003 года такое обращение было направлено в Конституционный суд (его полный текст был опубликован в "Народной воле"). 8 августа пришел ответ из Конституционного суда.

Аргументы Конституционного суда: убедительны ли они?

Как следует из ответа председателя Конституционного суда Г.Василевича, представители власти должны пользоваться повышенной защитой посредством закона. В качестве примера делается отсылка на работников милиции, чья деятельность, как известно, сопряжена с определенным риском для жизни и здоровья.

В качестве аргумента в пользу сохранения статей 367 — 369 УК используется законодательство ряда зарубежных государств, в том числе России, Литвы, Узбекистана, Казахстана, Кыргызстана, Таджикистана. В этот перечень попали и западные монархии (Голландия, Испания), где по традиции охраняется честь и достоинство царствующих особ.

Что касается наших бывших "братьев" по единому социалистическому лагерю, то наличие в их уголовном законодательстве подобных статей в комментарии, надо полагать, не нуждается. В отношении же западных демократий следует отметить, что за последние десятилетия ни один журналист не был привлечен к уголовной ответственности за клевету и оскорбление высших должностных лиц. И это несмотря на то, что тамошние журналисты не особенно стесняются в выражениях, критикуя руководителей своих и чужих стран.

Хотим подчеркнуть: общественные фигуры (к таковым в первую очередь относятся главы государств) в европейских странах не ограждены специальными правовыми мерами защиты от диффамации. Скорее наоборот. Их поступки и высказывания находятся под пристальным вниманием журналистов и часто становятся темой скандальных сенсаций. Но никому из них не приходит в голову сводить счеты, а тем более прятать за тюремную решетку авторов острых, порой нелицеприятных публикаций.

Такое положение в цивилизованных странах имеет место потому, что первые лица государства являются такими же гражданами, как и остальные. У них нет каких-либо особых привилегий на защиту своей чести и достоинства. Характерным примером может послужить "дело" нынешнего канцлера ФРГ Герхарда Шредера к одному из немецких журналистов, который раскрыл общественности "страшный секрет": оказывается, г-н канцлер подкрашивает свои волосы. После этого последовал иск обиженного гражданина Шредера к журналисту. Истец доказывал перед всей Германией и остальным миром, что у него естественный цвет волос и в подкрашивании они не нуждаются.

Однако вернемся к письму Г.Василевича. После обоснования правомерности включения в уголовное законодательство специальных статей 367, 368 и 369 он неожиданно и вопреки логике делает ссылку на статьи 188 и 189 УК, которые предусматривают ответственность за клевету и оскорбление в отношении любого гражданина, охраняя его честь и достоинство.

Так об этом и говорилось в обращении БАЖа в Конституционный суд! В соответствии с Конституцией все равны перед законом (ст.22) и никто не может пользоваться преимуществами и привилегиями, противоречащими закону (ст.23). Ни гражданин-президент, ни тем более другие граждане — представители власти. Поэтому на них в полном объеме распространяются статьи Уголовного кодекса, предусматривающие ответственность за клевету и оскорбление (ст.ст. 188 и 189 УК).

В этой связи и был поставлен вопрос об исключении из уголовного законодательства статей, которые противоречат Конституции. При этом мы исходили из того, что, в соответствии с общепринятой практикой законотворчества, ни один правовой акт не может противоречить Основному закону страны. Мы надеялись, что именно с такой позиции Конституционный суд рассмотрит обращение журналистской организации. Однако этого не случилось.

Справедливости ради отметим, что Конституционный суд попытался в какой-то мере смягчить последствия применения вышеуказанных статей Уголовного кодекса. Как сообщается в ответе, проблема в большей степени заключается в *"правильном установлении в правоприменительной практике признаков преступлений, предусмотренных статьями 367—369 УК"*.

Насколько правоприменительная практика "правильная", мы убедились по делам журналистов газет "Пагоня" и "Рабочы". Органами предварительного следствия и судом не были объективно доказаны факты клеветы и оскорбления в отношении главы государства. Тем не менее в ходе "правильного установления признаков преступления" журналисты были осуждены.

Как стало известно из дополнительного письма Конституционного суда в адрес БАЖа от 4 сентября 2003 года, Конституционный суд предложил Палате представителей внести в Уголовный кодекс дополнение, чтобы *"критические замечания, сделанные в адрес представителя власти, не сопряженные с распространением ложных, позорящих его измышлений, либо с умышленным унижением чести и достоинства, выраженным в неприличной форме, не могли рассматриваться как преступление"*.

Трудно представить, как парламентарии реализуют предложение Конституционного суда, поскольку на практике не выработано четких критериев, позволяющих определить ту грань, где заканчивается критика и начинается клевета и оскорбление. Можно только предположить, что, как и прежде, решение по этому вопросу будут принимать наши прокуроры и судьи, руководствуясь своими, только им известными критериями.

Тысячи граждан — за отмену репрессивных статей

Диаметрально иной точки зрения на проблему статей 367 — 369 УК придерживаются те граждане страны, которые поставили свои подписи под обращением общественного объединения "Белорусская ассоциация журналистов". Они не только правильно поняли суть этой, казалось бы, чисто юридической проблемы, но и проявили гражданское мужество, выступив, по сути, "судом присяжных". В атмосфере насаждаемого властью страха и подозрительности эти люди не побоялись высказать свое мнение.

Мы благодарны всем, кто поддержал нашу инициативу. Эта поддержка вдохновляет нас на продолжение кампании за отмену дискриминационных статей УК. Мы будем и впредь отстаивать право на свободу слова и информации, а также добиваться реализации в полном объеме одного из главных конституционных принципов — равенства всех перед законом.

Мы по-прежнему настаиваем на исключении из действующего Уголовного кодекса статей 367 — 369 как противоречащих Конституции. Такой шаг приблизит наше законодательство к европейским стандартам и положит конец практике осуждения журналистов за выражение ими своих политических взглядов и критику государственных чиновников всех рангов.

Михаил ПАСТУХОВ, Юрий ТОПОРАШЕВ, юристы Центра правовой защиты СМИ при ОО "Белорусская ассоциация журналистов".

ПУЛЬС

Беларускія студэнты — пераможцы Міжнароднай матэматычнай алімпіяды

У Беларускім дзяржаўным універсітэце адбылося ўшаноўванне пераможцаў і прызёраў X Міжнароднай студэнцкай матэматычнай алімпіяды.

Алімпіяда праходзіла з 25 па 31 ліпеня гэтага года ў Румыніі. У ёй узялі ўдзел 40 вядучых універсітэтаў з 24 краін.

Удзельнікі з Беларусі паказалі бліскуючы вынік. **Іван Лосеў**, **Аляксандр Усніч**, **Трафім Ласы**, **Дзмітрый Бадзягін**, **Мікіта Селінгер**, **Сяргей Маркоўскі**, **Максім Жыховіч і Яўген Зорын** заваявалі залатыя медалі, **Давід Змяйкоў** — сярэбраны і **Дзмітрый Дудко** — бронзавы медалі. Апрача таго, Іван Лосеў і Аляксандр Усніч падзялілі абсалютнае 1 месца, набраўшы 232 балы з 240 магчымых, і атрымалі Гран-пры спаборніцтваў. У неафіцыйным камандным заліку зборная БДУ стала лепшай камандай на алімпіядзе, апярэдзіўшы на 25 балаў каманду Венгрыі.

Рэктар Белдзяржуніверсітэта **Аляксандр Казулін** падпісаў загад аб узнагароджанні пераможцаў і прызёраў алімпіяды грашовымі прэміямі: за Гран-пры — 700 тысяч рублёў, за залаты медаль — 500 тысяч рублёў, сярэбраны — 400 тысяч рублёў і бронзавы — 300 тысяч рублёў; трэнер каманды прэміраваны 1 мільёнам рублёў.

Вольга АСІПЕНКА.

БХК звярнулася да Мінюста

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Беларускі Хельсінкскі камітэт" (БХК) звярнулася да міністра юстыцыі Віктара Галаванава з матываванай просьбай аб адмене пісьмовага папярэджання, вынесенага арганізацыі 15 жніўня. Таксама РГА БХК накіравала скаргу ў Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе БХК, папярэджанне, вынесенае Міністэрствам юстыцыі за выкарыстанне бланка, штампа і пячаткі, на якіх "назва арганізацыі не адпавядае статутнай", стварае фармальныя прававыя перадумовы для наступнай ліквідацыі аб'яднання.

БХК лічыць, што вынясенне папярэджання супярэчыць патрабаванням артыкулаў 25—28 Закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях", а таксама канстытуцыйным гарантыям свабоды аб'яднанняў і міжнародным абавязацельствам Беларусі.

Аляксей ШЭІН.

Пташука вылучылі на саюзную прэмію

Беларускі саюз кінематаграфістаў (БСК) вылучыў кандыдатуру выдатнага рэжысёра Міхаіла Пташука на суісканне прэміі ў галіне літаратуры і мастацтва за значны ўклад ва ўмацаванне культурнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй. Пра гэта паведаміў старшыня БСК, кінарэжысёр-аніматар Ігар Волчак.

Паводле яго слоў, усё творчае жыццё Пташука было "пасапраўднаму і глыбока аддадзена тэме народнага подзвігу на працягу розных трагічных гадоў нашай гісторыі". У якасці прыкладаў ён прывёў тэлевізійны серыял "Час выбраў нас", які расказвае аб маладзёжным падполлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і мастацкі фільм "Вазьму твой боль" па вядомым рамане Івана Шамякіна. Ігар Волчак таксама нагадаў пра вялікі поспех карціны Міхаіла Пташука "Знак бяды", прысвечанай духоўнай моцы беларускага народа ў час фашысцкай акупацыі. Пасля "Знака бяды" Пташук быў афіцыйна ўнесены ў дзесятку лепшых рэжысёраў Еўропы, сказаў Волчак, а апошняя карціна рэжысёра — "У жніўні сорак чацвёртага..." — была названа за мяжой "лепшым рускім хітом пра вайну".

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

Абараняўся ад сабак, а ледзь не застрэліў жанчыну

У апошнюю зводку здарэнняў па Гомельшчыне трапіў беспрэцэдэнтны выпадак, што адбыўся на адным з дачных участкаў у Светлагорскім раёне. 68-гадовы пенсіянер зрабіў прыстасаванне, якое павінна было абараніць яго дачны ўчастак ад бяздомных сабак.

Супрацоўнікі міліцыі ацанілі гэтае прыстасаванне як унікальнае. Яно складаецца з лескі, звычайнай мышалоўкі, трубкі і забяспечана паляўнічым патронам. Працуе апарат па прынцыпе расцяжкі: леска, устаноўленая на ўчастку, тузае мышалоўку, тая, у сваю чаргу, закрываецца, націскае на баёк і адбываецца стрэл.

Аднак замест бадзяжных сабак ахвярай вынаходства стала жыхарка Светлагорска 1967 года нараджэння. У пошуках сваіх дзяцей жанчына вырашыла скараціць шлях праз суседнія ўчасткі і закранула леску. У выніку пацярпелая атрымала раненне ў нагу.

Самаробнае прыстасаванне канфіскавана супрацоўнікамі міліцыі і цяпер знаходзіцца на экспертызе, якой трэба вырашыць: ці з'яўляецца дадзены апарат агнястрэльнай зброяй.

На "вынаходніка", тым часам, заведзена крымінальная справа па артыкуле 155 Крымінальнага кодэкса Беларусі (нанясенне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання па неасцярожнасці). У лепшым выпадку яму пагражае штраф або папраўчыя працы.

Алена КАЛАЧОВА.

Залатая гарэлка

Тэхналогія вытворчасці ў літаральным сэнсе залатой гарэлкі распрацавана на Гродзенскім лікёра-гарэлачным заводзе.

Размова ў дадзеным выпадку ідзе не пра цану, хаця каштаваць яна будзе, паводле разлікаў спецыялістаў прадпрыемства, удвая даражэй за звычайную. Проста адным з кампанентаў напою стане сусальнае золата.

Паводле разлікаў гродзенскіх спецыялістаў, у адной паўлітровай бутэльцы павінна ўтрымлівацца прыкладна 0,002 грама жоўтага металу, крышталікі якога, пераліваючыся, створаць ілюзію, што ўся вадкасць залатога колеру.

Дызайнеры завода прапануюць выпускаць залатую гарэлку ў рознай упакоўцы — звычайных бутэльках і элітных, сувенірных штофах, па форме падобных да шапкі Манамаха. Рабочая назва навінкі — "Залатыя купалы".

Да канчатковага прыняцця гарэлкі да вытворчасці не хапае пакуль дазволу Міністэрства аховы здароўя, якое наважана грунтоўна вывучыць усе магчымыя наступствы рэалізацыі ідэі гродзенскіх тэхнолагаў.

Віктар МАКАРЭВІЧ.

СУДЬБЫ

Воспоминания в саду Манфреда Цабеля

Слева — направо: Б.Мельцер, Л.Шепетинская, Л.Абрамович, Я.Шепетинский, Л.Цабель, М.Цабель (г.Зиген август 2003 г).

Ну кто мог представить, что в провинциальном немецком городке Зиген (земля Северный Рейн-Вестфалия) судьба сведет нескольких наших земляков, приехавших кто из Бруклина, кто из Тель-Авива, кто из Слонима...

Яков Шепетинский приехал с женой Люсей и внуком Раном — бывшим десантником израильской армии. Яша пригласил также с собой двух "киношников" — Бориса с женой Светой. Люба Абрамович с мужем профессором Беньямином Мельцером прилетели из Америки. Она — бывшая узница Слонимского гетто, партизанка отряда имени Ворошилова (Липичанская пуща).После войны работала переводчицей в различных организациях Минска.

Яша Шепетинский не виделся с Любой, своей бывшей одноклассницей по довоенной Слонимской гимназии, тридцать лет.

В Германии Люба с Беньямином гостили в семье евангелистского пастора, профессора теологии Зигенского университета Манфреда Цабеля. Манфред и его гостеприимная жена Лизалотта принимали у себя наших земляков уже не первый раз. Профессор является одним из активных членов местной организации "Иудейско-христианское сотрудничество" и одновременно активистом Минского международного образовательного центра (IBB). Благодаря его поддержке Любе и Беньямину была предоставлена возможность выступать здесь с лекциями о Холокосте, о еврейской культуре перед студентами, гимназистами... В Германии перевели и издали на немецком языке две брошюры Любы, в которых она рассказывает о фашистском терроре на Слонимщине.

С Яшей Шепетинским вышла иная история. После приезда в Израиль в 1966 году инвалид Шепетинский (у него нет стопы) более пятнадцати лет проработал армейским фотографом. Затем написал книгу воспоминаний. Не зря он посвятил ее жене Люсеньке — верной спутнице и помощнице, педиатру по образованию. Именно она постоянно уговаривала его взяться за работу над книгой.

Книгу "Лестница Якова" издали сначала в Израиле на иврите, затем в Англии, потом в Польше. В прошлом году ее выпустили снова в Израиле, но уже на русском языке. В русском варианте она называется "Приговор". В отличие от многих мемуаров, Яшина книга написана самим автором, а не с его слов — простой житейский язык, "непричесанные" выражения из армейской или зековской жизни... Он не подрывал эшелонов, не сбивал вражеских самолетов. Он был рядовым солдатом большой войны. И тем не менее книга необычна, как необыкновенна судьба ее автора. Шансов выжить у него не было, но все-таки он выжил! Выжил после расстрела, выбравшись ночью из заваленного трупами котлована; выжил в партизанах, выжил на фронте, дойдя до Берлина; выжил в сталинских лагерях на Северном Урале.

Один из белорусских посольских работников, прочитав книгу, схватился за голову: "Да это же наш герой! У нас в Слониме родился, у нас партизанил..."

Яше наобещали золотые горы и всемерную помощь в съемках документального фильма в Беларуси. Попросили выполнить лишь одну формальность: написать заявку с указанием мест, которые он хочет посетить.

Уже собралась команда для поездки в Беларусь, а ответа из посольства все нет и нет. Затем стали происходить непонятные вещи. То просили прислать какие-то бумаги, через некоторое время опять потребовали новые справки, а потом вообще посоветовали обратиться с этой просьбой в другие инстанции. Наконец всем участникам группы стало ясно: вся эта бюрократическая возня и отфутболивание на дипломатическом языке означает лишь одно: "Ваш приезд в Беларусь нежелателен!" И получил старый солдат в итоге очередной пинок пониже спины от бывшей Родины. Но ему не привыкать: по сравнению с десятью годами лагерей или расстрельной ямой под деревней Чепелево — это все мелочи.

Сам он считает причиной отказа следующее: большой начальник в Минске просто побоялся дать "добро" киногруппе. А что еще вздумается им там снимать? Вдруг им захочется заснять раскопанные человеческие кости на братской могиле под Слонимом? (В трех километрах от Слонима, около шоссе на Барановичи, недалеко от деревни Чепелево находится место расстрела 9000 тысяч евреев. Сообщение о раскопках "золотоискателями" братской могилы периодически появлялись в местной прессе. Последнюю информацию об этом опубликовал журналист Коваленко в "Газете Слонимской" весной 2003 года.)

Или еще им вздумается показать наполовину разворованную металлическую ограду на кусочке восстановленного евреями кладбища в самом Слониме (за деньги, собранные земляками со всего света)? А может, чего доброго, покажут разваливающуся не по дням, а по часам и превращенную алкашами в туалет (при попустительстве местных властей) уникальный памятник белорусской архитектуры середины XVII — большую слонимскую синагогу? Денег, собранных иностранными спонсорами, хватило только на крышу. Так называемый ремонт длится уже двадцать лет. Пора заносить в Книгу рекордов Гиннесса. На бесценный исторический памятник у начальства денег не нашлось. Непонятно только, откуда у них берутся деньги на сооружение собственых коттеджей-особняков, расстущих вокруг, как грибы после хорошего дождя?

С поездкой в Беларусь у Якова не получилось, так может, получится хотя бы съездить в Германию, где воевал, где сидел в разных энкавэдэшных тюрьмах, где побывал с краткосрочным визитом, уже будучи гражданином Израиля, когда в Гамбурге судили Слонимского гебитскомиссара Эррена...

Его удивляло, что везде, куда бы он ни обращался в Германии, ему давали "зеленый свет", вплоть до того, что открывали двери тюремных камер (некоторые тюрьмы действуют до сих пор). Это удивление не покидало его и тогда, когда, несмотря на невиданную августовскую жару и время летних отпусков, в небольшом зале тематического музея собрались на встречу с двумя белорусскими партизанами человек сорок местных немцев!

Нет, нужно вообразить себе и прочувствовать необычность ситуации: перед детьми и внуками бывших солдат Вермахта выступает бывшая партизанка и рассказывает, как в Международный женский день 8 Марта она подорвала вражеский эшелон! (Кстати, Люба упомянула только об одном эшелоне. В книге командира Щучинского партизанского соединения С.П.Шупени "Гневная Щара" пишется, что на ее счету несколько подорванных эшелонов.)

Любу и Яшу тепло встретил коллектив врачей больницы в Креденбахе, куда их пригласил "фанат Беларуси", так он сам себя назвал, доктор Брюгман. Людвиг и Вибке Брюгман вот уже несколько лет вместе с другими такими же фанатами ездят в Беларусь. В деревне Дружная (недалеко от озера Нарочь) на пожертвования, собранные немцами, они строят добротные двухэтажные дома для людей из Чернобыльской зоны.

Конечно, во время визита Шепетинского не обошлось без определенной официальной поддержки. Известный журналист Хайнц-Рудольф Отмеринг, узнав о Яше, постарался составить ему протекцию во всем, что касается съемок. Но это одно дело, а другое — приятное открытие, сделанное Яковом и Любой: они видели, как простые немцы стараются во всем им помочь и делают это от души, без какой-то просьбы "сверху".

Люба рассказывала потом, с каким страхом она когда-то ехала на Гамбургский процесс: пережив гетто, потеряв ребенка и мужа в кровавой мясорубке, устроенной оккупантами...

В каждом прохожем мужчине своего возраста, встреченном на улицах Гамбурга, ей виделся эсэсовец и каратель, убийца ее ребенка и мужа, всех близких... Но в этом же городе над ней взяли шефство три немки, три удивительные женщины, ставшие потом ее добрыми подругами. И лед ненависти, недоверия, страха начал таять. Она воочию убедилась, что Германия уже другая.

Удивили наших гостей и добрые отклики-рецензии на их выступления, опубликованные в нескольких местных газетах. Это была не просто сухая информация, а серьезные статьи-размышления, проникнутые глубоким гуманистическим духом.

В брежневские годы в советской прессе утверждалось, будто западные политики пытаются обелить, оправдать нацистских преступников. Ничего подобного! Даже сейчас, если он древний старик, преступника стараются посадить на скамью подсудимых. Гамбургские процессы 60—70-х годов над карателями, виновными в гибели десятков тысяч жителей Слонимщины, были начаты по инициативе немецкой стороны. Это немецкие, тогда западно-немецкие, юристы разыскивали по всему свету оставшихся в живых свидетелей массовых экзекуций на Слонимщине.

Когда-то у нас писали, будто жители Германии совершенно не знают о зверствах нацистского режима. Да, возможно, во время войны и не знали. Нацисты скрывали свои преступления. Ведь в немецких городах не вешали публично на площадях, как это было повсюду в Беларуси. Своих противников нацисты уничтожали в тюремных подвалах и двориках... Все это творилось вдали от глаз обывателя. Даже люди, жившие рядом с Бухенвальдом, Заксенхаузеном и т. д., не знали, что делается там, за колючей проволокой этих фабрик смерти. Теперь они знают об этом, возможно, больше нас.

Геноцид изучается в школах. Дни Памяти фашистских жертв отмечаются по всей стране. Немецкое правительство подает пример во время проведения различных мероприятий, связанных с памятью жертв Холокоста. Периодически в городах проходят фотовыставки, организуются антифашистские семинары, просмотры документальных фильмов, экскурсии в лагеря смерти. Памятные знаки, доски, стелы, напоминающие о нацистских жертвах, можно встретить повсюду: на перронах вокзалов, на стенах домов, в скверах...

Даже пожив в Германии всего несколько месяцев, можно с уверенностью делать следующие выводы: вся их система воспитания (начиная с детского сада), вся идеологическая работа, все немецкое искусство, деятельность СМИ и т. п. — все пропитано духом демократизма, человеколюбия, антифашизма. По немецкому телевидению идут антифашистские сериалы (например, "Семья Клемперер"). Огромный положительный резонанс в прессе вызвал наш фильм "Иди и смотри". Немецкая конституция не дает возможности возродиться фашизму. Государство строго пресекает деятельность как ультраправых, так и ультралевых группировок. На "блошиных" рынках здесь можно увидеть всякое старье, в том числе и вещи времен третьего Рейха. Однако, не дай Бог, если свастика на тарелке, кружке и т.п. не будет замазана, заклеена... На первый раз могут влепить большой штраф. Как ни странно, но свастику на заборах, на стенах у нас в Беларуси я встречал чаще, чем в Германии.

По всей стране прошли массовые демонстрации протеста, когда года три назад в Дюссельдорфе около группы еврейских эмигрантов из СНГ взорвалась граната. Тогда несколько человек получили ранения. На следующий день на улицы города вышли 40 тысяч человек, протестующих против проявления неонацизма. Пресса поспешила обвинить во всем ультраправых, хотя у следствия были серьезные подозрения, что это результат каких-то криминальных разборок в среде эмигрантов.

Похоже, что белорусское руководство слабо ориентируется во внутриполитической обстановке в Германии. Чем же еще можно объяснить, что А.Лукашенко, желая сделать немцам комплимент, пытался в интервью одной немецкой газете выискивать положительные черты в политике Гитлера?! Если бы его советники знали, насколько глубоко вся внутренняя жизнь Германии проникнута духом антифашизма, они бы не позволили ему допустить такой ляп!

Но вернемся к нашим главным героям. График их визита был действительно напряженный, и все-таки мы имели возможность пообщаться, отдохнуть, что называется, душой и телом. За большим столом, в маленьком, но уютном саду супругов Цабель за фужером красного вина беседа велась непринужденно. Люди вспоминали, шутили, смеялись. Люди разных возрастов, верований, профессий. Слышалась русская, польская, немецкая, еврейская, английская речь.

Одни нашли в себе мужество и мудрость разделить ответственность за преступления своих отцов-дедов — весь мир помнит фото Вилли Брандта, стоящего на коленях перед памятником жертвам Варшавского гетто; другие нашли силу и волю преодолеть страх, ненависть к людям, к стране.

Около клумбы я стал разглядывать небольшую, сантиметров шестьдесят высотой, проникнутую глубоким символическим смыслом скульптуру: несколько человек, обнявшись за плечи и образовав круг, исполняют какой-то танец. Лизалотта, заметив мое внимание, прокомментировала, кивая в сторону мужа: *"Это же он ее из Мексики притащил!"*

Было интересно наблюдать заботливые отношения между людьми, на чью долю выпали тяжелейшие испытания, которые сохранили при этом чувство юмора. Люся за годы совместной жизни с Яковом немало наслушалась его тюремного сленга, поэтому, глядя на развеселившегося, раскрасневшегося мужа, не упустила случая сделать ему замечание: "Яша, что ты ходишь, как бесконвойный! Заправь, пожалуйста, рубашку!"

Беньямин Мельцер в свои 88 лет обладает феноменальной памятью. Он сыплет поговорками сразу на нескольких языках. Но жена начеку: — Беня, не пей столько!

— Не волнуйся, я же не буду весь фужер залпом!

Профессор Мельцер долгие годы работал в БГУ. Он считался ведущим специалистом в области Римского права, так что многие из наших юристов, историков были на его лекциях. Тепло вспоминал профессор о Янке Брыле, о Михаиле Ткачеве.

— Он остался для меня Мишей даже тогда, когда уже стал доктором наук. Хороший спортсмен. У них весь курс подобрался на редкость удачный и в спортивном и в интеллектуальном плане. Миша был воспитанный и скромный парень, с приятной, открытой улыбкой. С годами он мало изменился. Его скромность порой доходила до стеснительности. Он был патриотом белорусской культуры, до конца преданный белорусской идее...

Профессор дипломатично обходил стороной мои вопросы по поводу нынешнего политического состояния Беларуси.

— Я вам правду скажу: битая собака любой палки боится! Меня с работы никто не выгонял. Можно было работать и дальше. Но наши родственники перебрались в Америку, и мы с женой решили быть ближе к ним. Я еврей и очень благодарен Беларуси! Здесь я смог реализовать свои способности. Здесь я состоялся как преподаватель. Я желаю Беларуси добра!

Люба, сидевшая рядом, добавила: — Я люблю этот край, эту землю и считаю, что Беларусь должна быть независимой и самостоятельной!

На вопрос о сегодняшнем житье-бытье в Америке профессор ответил, что жаловаться грех, хотя с грустной улыбкой добавил: "Американская бюрократия своей "зубастостью" не уступает советской". И за океаном бывший университетский преподаватель нашел применение своим энциклопедическим знаниям. Только в Нью-Йорке живет уже около тысячи бывших узников гетто — благодарная аудитория для профессора Мельцера. Преподавательская работа продолжается.

...Смеркалось. В саду становилось темно. Манфред Цабель зажег и поставил на стол "бабушкину" лампу — семейную реликвию. Как-то сразу утихли разговоры, неяркий свет лампы освещал посерьезневшие лица. Всем взгрустнулось от предчувствия скорого расставания. Налили по последнему бокалу вина. И тут стопроцентный "ариец" немец Цабель затянул еврейскую народную песню. Большинство сидевших за столом подхватили мелодию. Глядя на этот слаженный хор, почему-то вспомнилась фраза из Святого писания: "Блаженны миротворцы..."

Игорь ПОДГОРОДЕЦКИЙ.

Помнім 19 верасня!

"На сесіі Вярхоўнага Савета БССР 19 верасня 1991 г. зацверджана назва "Рэспубліка Беларусь", а ў скарочаных і састаўных назвах — "Беларусь", устаноўлена, што гэтыя назвы трансліт арыруюцца на іншыя мовы ў адпаведнасці з гучаннем. У якасці дзяржаўнага герба зацверджаны старажытны беларускі герб "Пагоня", а ў якасці дзяржаўнага сцяга — бел-чырвона-белы сцяг".

Так адзначаны гэты дзень у артыкуле В.С.Цітова "Беларусь", змешчаным у 1-м томе "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (Мінск, 1993).

А што чытаюць і вывучаюць вучні школ пра гэта апошнімі гадамі? Паглядзім падручнікі.

У вучэбным дапаможніку У.Н.Сідарцова, В.М.Фаміна, С.В.Панова для 9 класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук прафесара М.С.Сташкевіча (выпушчаны ў Мінску ў 1999 г.) на с.156 напісана, што ў гэты дзень была зацверджана "дзяржаўная сімволіка", але не сказана, якая. Тым не менш на гэтай старонцы змешчана чорна-белая копія выявы "Пагоні" — дзяржаўнага герба Беларусі ў 1991—1995 гг. У сінхранічнай табліцы "Асноўныя падзеі беларускай і сусветнай гісторыі" (1917—1996) на старонках 183—186 пра зацвярджэнне назвы і дзяржаўных сімвалаў нічога не сказана. У храналагічнай табліцы на с. 188 пад гэтым днём падаецца "Закон аб новай назве нашай дзяржавы — Рэспубліка Беларусь". На ўнутраных вокладках дапаможніка ёсць згадкі пра 25 сакавіка 1918 г. — абвяшчэнне незалежнасці БНР, 1 студзеня 1919 г. — абвяшчэнне БССР і верасень 1991 г. — пра новую назву краіны "Рэспубліка Беларусь". Мабыць, 19 верасня — неістотны дзень для аўтараў падручніка.

А зараз пра паралелі на ўнутраных вокладках, так званыя паліндромы, якія падаліся мне цікавымі: першая падзея ў дапаможніку — пераход улады да бальшавікоў, апошняя — выбранне першага прэзідэнта; другая падзея — першы Усебеларускі нацыянальны з'езд, перадапошняя — дзень Канстытуцыі 15 сакавіка 1994 г.; чацвёртая спераду — абвяшчэнне незалежнасці БНР 25 сакавіка 1918 г., чацвёртая перад канцом — новая назва краіны "Рэспубліка Беларусь"; пятая спераду — абвяшчэнне БССР, пятая перад канцом — Дэкларацыя аб абвяшчэнні суверэнітэту БССР; шостая спераду — стварэнне Літбел ССР, шостая перад канцом — чарнобыльская катастрофа; сёмая спераду — другое абвяшчэнне БССР, сёмая перад канцом — курс на перабудову... У цэнтры ўсіх падзей — пачатак індустрыялізацыі і суцэльнай калектывізацыі.

У вучэбным дапаможніку С.В.Панова, У.Н.Сідарцова, В.М.Фаміна для 11 класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук прафесара М.С.Сташкевіча, выпушчаным у Мінску ў 2001 г., у раздзеле "Дзяржаўная сімволіка" на с.154 напісана, што "першапачаткова Вярхоўны Савет БССР 19 верасня 1991 г. у якасці дзяржаўнай сімволікі зацвердзіў Дзяржаўны герб "Пагоня" і флаг *(агульнапрынятая ў дзяржаўным асяродку калька замест "сцяга". — **М.Л.**)* з трыма гарызантальнымі бел-чырвона-белымі палосамі. Стваральнікі гэтай сімволікі звязвалі яе з гістарычным мінулым беларускага народа. Аднак многія жыхары Беларусі выказвалі нязгоду з такой сімволікай па прычыне таго, што яна ўжывалася беларускімі калабарантамі падчас Вялікай Айчыннай вайны". У дадзеным месцы гэты падручнік нагадвае падручнік не па роднай гісторыі, а па ідэалогіі...

Бедныя дзеці! Яны так часта скардзяцца на дрэнныя падручнікі. І маюць рацыю. Бо выкладанне сапраўднай гісторыі ў прыватнасці залежыць ад настаўнікаў і ад іх здольнасцей, а авалоданне ёю — ад самаадукацыі вучняў. Падручнікі аказваюцца ні пры чым...

І яшчэ трошкі пра сённяшні дзень 19 верасня. Прапаную яго лічыць ДНЁМ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ СІМВАЛАЎ БЕЛАРУСІ і адсвяткаваць са сваімі сем'ямі альбо сябрамі.

Са святам!

Жыве Беларусь!

Міхась ЛЕБЕДЗЬ.

Граната для стаматолага?

Пракуратура Оршы вядзе расследаванне крымінальнай справы, узбуджанай у сувязі з надзвычайным здарэннем — выбухам гранаты, ад якога пацярпела пяцёра супрацоўнікаў міліцыі, адзін з якіх загінуў.

Гэтая трагічная гісторыя пачалася з тэлефоннага званка ў Гарадскі аддзел унутраных спраў. Паведамлялася, што ў памяшканні прыватнага стаматалагічнага кабінета, размешчанага ў Доме быту мікрараёна "Задняпроўе", знаходзіцца пластыкавая ёмістасць з баявой гранатай унутры.

На месца неадкладна выехала група хуткага рэагавання з пяці міліцыянераў, якія замест таго, каб паклікаць на дапамогу спецыялістаў па размініраванні, праявілі залішнюю адвагу: вырашылі самастойна вывезці небяспечную знаходку з горада. Людзі ў пагонах сталі перадаваць гранату адзін аднаму. Выбух грымнуў, калі граната апынулася ў кабіне аператыўнай машыны. Прапаршчык Іван Раманаў загінуў адразу, а чацвёра ягоных таварышаў з раненнямі былі дастаўлены ў бальніцу. Аднаго, найбольш сур'ёзна пацярпелага, міліцыянера давялося тэрмінова адвезці ў сталічны шпіталь МУС.

Згодна з адной версіяй следства, граната, падкладзеная ў стаматалагічны кабінет, была формай помсты гаспадару лячэбніцы за тое, што ён не згаджаўся плаціць "даніну" мясцовай крымінальнай групоўцы вымагальнікаў.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Мытнікі папаўняюць бюджэт

Гадавы план паступленняў у даходную частку рэспубліканскага бюджэту мытныя органы Беларусі наважаны выканаць да канца лістапада. Пра гэта заявіў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта **Аляксандр Шпілеўскі**.

Паводле яго слоў, з запланаваных на год паступленняў у суме 1 трлн. 496 млрд. рублёў на сённяшні дзень мытнікамі ўжо пералічана 1 трлн. 281 млрд. рублёў. Рост паступленняў мытных плацяжоў у бюджэт кіраўнік ДМК патлумачыў некалькімі прычынамі. У першую чаргу, "некаторым ажыўленнем" знешнеэканамічнай дзейнасці і звязаным з гэтым ростам аб'ёмаў перавозкі грузаў.

Значны рост паступленняў кіраўнік ДМК звязвае з цэлым комплексам фактараў, у ліку якіх — абуладкаванне межаў і пунктаў мытнага афармлення, змяненне падыходаў да вызначэння мытнага кошту, скарачэнне колькасці мытных працэдур і часу прастою на мяжы.

Дзяржаўны мытны камітэт таксама працягвае супрацьдзейнічаць такім відам злачынстваў, як транзіт наркотыкаў, алкагольных напояў, цыгарэт, бытавой электроннай тэхнікі, гандаль выкрадзенымі аўтамабілямі, незаконны вываз валюты, твораў мастацтва, культурных і гістарычных каштоўнасцяў, незаконны абарот грашовых сродкаў, атрыманых у выніку злачыннай дзейнасці. З гэтага года мытнікамі спынена амаль 11 тысяч злачынстваў і правапарушэнняў. Кошт канфіскаваных тавараў і транспартных сродкаў склаў 116 млрд. 400 млн. рублёў.

Пошліны на замежныя аўто не павысяцца

У Дзяржаўны мытны камітэт (ДМК) ніякіх указанняў па павышэнні пошлін на ўвозімыя ў Беларусь замежныя аўтамабілі не паступала.

Як адзначыў старшыня ДМК Аляксандр Шпілеўскі, распрацоўка якіх-небудзь дакументаў на гэты конт мытнікамі таксама не праводзіцца. Выказваючы сваю асабістую пазіцыю, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта, які адказвае за фарміраванне даходаў бюджэту, заявіў, што "быў бы вельмі засмучаны, калі б гэты факт стаў явай". Пры гэтым ён нагадаў, што, у адрозненне ад Расіі, якая нядаўна значна павысіла пошліны на ўвоз патрыманых замежных аўтамабіляў, Беларусь не вырабляе легкавых аўтамабіляў. Значыць, няма неабходнасці прымаць такога кшталту пратэкцыянісцкія меры. Хаця, падкрэсліў Шпілеўскі, рашэнне аб гэтым у любым выпадку прымае ўрад краіны. Расійскае кіраўніцтва на неабходнасці аналагічнага павышэння пошлін у Беларусі пакуль не настойвае.

Аляксей АРЭШКА.

Тоны саляркі на зямлі

Дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам бензавоза адбылося а дзесятай гадзіне раніцы 17 верасня ў Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці непадалёк ад вёскі Залессе.

Імкнучыся пазбегнуць сутыкнення з іншым аўтамабілем, кіроўца бензавоза МАЗ вырашыў збочыць. Машына выйшла з-пад кантролю, і праз некалькі секунд пасля манеўру цягач бензавоза лёг на бок. Прычэп з 8,5 тоны саляркі ўстаяў на дарозе, аднак з паветранага клапана вылілася каля тоны дызпаліва, якое хутка пранікла ў зямлю.

Вадзіцель МАЗа змог самастойна выбрацца з кабіны. Да 11 гадзіны пры дапамозе двух трактароў цягач быў устаноўлены на колы, а потым працягнуў шлях да месца прызначэння ў суседнюю Гродзенскую вобласць.

Дзмітрый БЕЛЬСКІ.

ДАЙДЖЕСТ

Изгнанные Хусейном иракцы снова смогут получить гражданство

Иракский правительственный совет принял новый закон о гражданстве, одним из пунктов которого является возвращение гражданства лицам, лишенным его при режиме Саддама Хусейна. Как отмечает арабская газета "Аш-Шарк Аль-Аусат" со ссылкой на члена совета Ахмеда Чалаби, по закону, принятому в среду, иракцы также смогут иметь двойное гражданство.

Согласно закону №666 от 1980 года тысячи иракцев были лишены гражданства по политическим, этническим и религиозным соображениям. Лицам, принявшим гражданство другого государства, по закону запрещалось возвращаться на родину.

Ранее в совет был также внесен законопроект, уравнивающий мужчин и женщин в гражданских правах.

Подозреваемый в убийстве Анны Линд отрицает свою вину

Мужчина, арестованный шведской полицией по подозрению в совершении нападения на министра иностранных дел Швеции Анну Линд, утверждает, что не виновен в ее смерти. Как заявил журналистам адвокат подозреваемого Гуннар Фальк, полиция задержала не того человека. Напомним, что Анна Линд получила несколько ножевых ранений в результате нападения, которому она подверглась 10 сентября в одном из магазинов Стокгольма. На следующий день глава МИД Швеции умерла от полученных ран.

«Конкорд» совершил экстренную посадку в Англии



В результате проблем с одним из двигателей в аэропорту Кардиффа столицы Уэльса, Великобритания, вынужденную посадку совершил авиалайнер "Конкорд", принадлежащий авиакомпании British Airways. Самолет следовал в лондонский аэропорт Хитроу из аэропорта имени Кеннеди в Нью-Йорке. Никто из 99 пассажиров не пострадал. По словам представителя авиакомпании, необходимость экстренной посадки была вызвана тем, что из-за неполадок с двигателем самолет пролетел часть маршрута на дозвуковых скоростях, в результате чего было израсходовано слишком много топлива.

В горах Шотландии нашли древнейшие в мире гениталии

Ученые нашли в горах Шотландии древнейшие в мире гениталии, которые принадлежали насекомому, жившему 400 млн. лет назад. Найденный половой орган долгоножки равен примерно двум третям длины ее тела и схож с гениталиями современных насекомых, сообщает журнал New Scientist.

"Обнаружение древнейших в мире гениталий доказывает, что за 400 млн. лет этот орган не особенно изменился, по крайней мере у насекомых", — говорится в статье.

США следят за сотрудничеством России и Ирана

Вопрос о сотрудничестве российских компаний с Ираном находится под постоянным и пристальным вниманием американской стороны. Об этом заявил старший зам.госсекретаря США Джон Болтон, завершивший консультации с заместителем главы МИД России Сергеем Кисляком. "Этот вопрос является предметом нашего постоянного внимания", — сказал он. Болтон отметил, что введение администрацией США экономических санкций в отношении тульского Конструкторского бюро приборостроения (КБП) было продиктовано законодательством Соединенных Штатов: "Санкции были введены, поскольку так требует наш закон". Накануне стало известно, что администрация США объявила о введении экономических санкций в отношении КБП, продавшего, согласно заявлению госдепартамента, технику военного назначения Ирану.

Начиная с 25 августа КБП в течение года запрещено вести дела с правительством США и запрещено получать лицензии на покупку в США товаров военного назначения. Представители КБП и генеральный директор Российского агентства по обычным вооружениям Александр Ноздрачев категорически опровергли эти обвинения. Отвечая на вопрос, возможно ли в будущем введение экономических санкций против других российских компаний, сотрудничающих с Ираном, Болтон сказал: "Когда мы выявляем факты сотрудничества компаний с Ираном, мы обязаны следовать нашему законодательству". В целом, комментируя иранскую ядерную проблему, которая вкратце была затронута в ходе консультаций Болтона в Москве, американский дипломат отметил: "Рассмотрев заявления моего коллеги Кисляка по этой проблеме, сделанные в эти выходные, я нашел их очень конструктивными и думаю, что мы, конечно, будем эту тему подробно обсуждать".

McDonald's намерен приучить клиентов к занятиям фитнесом



Руководство компании McDonald's приступает к тестированию нового вида детского продукта "Хэппи Мил" — для взрослых. Вместо привычных гамбургера и игрушки, в новый "Хэппи Мил", получивший название Go Active, входит салат, брошюра о фитнесе и шагомер. Цель новой акции — убедить потребителей в пользе физических упражнений. Руководство компании намерено опробовать новый продукт этой осенью в более чем 150 ресторанах на территории США.

Как стало известно, другой американский фаст-фуд-гигант — Burger King также намерен развиваться в этом направлении. В скором времени компания представит клиентам новые диетические куриные сэндвичи.

Стивен Кинг назван живым классиком современной литературы

Самый издаваемый писатель современности, "король ужасов" Стивен Кинг удостоен одной из высших литературных наград США — медали "За выдающийся вклад в американскую литературу". Таким образом, Кинг фактически вошел в лигу таких гигантов, как Джон Апдайк, Артур Миллер и Филип Рот. Церемония награждения, которую поручено вести знаменитому актеру Стиву Мартину, состоится в ноябре текущего года. Однако не все эксперты считают Кинга достойным столь высокой награды. Один из ведущих американских критиков Харольд Блум полагает, что Стивен Кинг является автором "дешевой поделки". "Если они искренне полагают, что эта литература имеет какую-либо ценность или служит эстетическому воспитанию, то это лишь признание их собственного идиотизма", — заявил Блум, комментируя решение "Национального книжного сообщества".

За годы творческой деятельности Стивена Кинга по всему миру было продано более 300 миллионов экземпляров его книг, по его произведениям снято несколько фильмов, два из которых — "Побег из Шоушенка" и "Зеленая миля" — стали многократными номинантами на премию Оскар. Сам Кинг считает, что присуждение ему награды, "пожалуй, самое замечательное событие в его жизни с момента опубликования первой книги".

Арафат показал прессе пулемет, из которого будет стрелять в израильтян

Лидер Палестинской автономии Ясир Арафат заявил, что готов умереть "мучеником", однако в случае, если израильтяне попытаются его депортировать, он будет защищать себя при помощи пулемета. "Я палестинский солдат... Я применю мое оружие для защиты не только себя, но и каждого палестинского ребенка, женщину и мужчину и для защиты существования Палестины", — сказал Арафат журналистам, указав при этом на пулемет, лежащий на полу рядом с его креслом в резиденции на Западном берегу. "Погибнуть как мученик? Да, а что, в Палестине есть кто-то, кто не мечтает стать мучеником?", — сказал Арафат.

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

Апошні дзень лета



Гэтую нібыта і невялічкую балячку на правай назе Васіль Асіпоўскі агледзеў яшчэ перад Калядамі. Тады яны з суседам Рыгорам Міхальчыкам хадзілі ў вясковую лазню і там, мыючыся, раптам ён абмацаў пальцамі нейкі бугарок вышэй костачкі. Быў ён цвёрды, памерам з добрую гарошыну, але не балеў. Васіль, можа, і забыўся б пра гэта, але кожны раз, абуваючыся і нацягваючы шкарпэтку, дакранаўся і ўспамінаў. З цягам часу ён заўважыў, што бугарок расце. Сказаў пра гэта жонцы Анюце.

— З'ездзі ў райцэнтр да дактароў, — параіла яна. — Цяперашнім часам усялякае бывае, не дай Бог, канешне. Лепш няхай паглядзяць.

Спецыяльна да доктара Васіль не паехаў, але, калі надышоў час праходзіць медыцынскі агляд, бо ён працаваў загадчыкам фермы, то паказаў хірургу гэты бугарок. Той доўга мацаў, пазіраў, спытаў ці баліць.

— Не баліць, але расце чамусьці. Можа, яго трэба выразаць? — спытаў Васіль.

— Пакуль што ў гэтым няма патрэбы. Але назірай, і калі часам пачне балець ці будзе расці далей, то прыязджай, выражам.

Бугарок рос, і ў сярэдзіне жніўня Асіпоўскі зноў падаўся да дактароў. Работы дома процьма: і атаву трэба было касіць, і салому ў калгасе атрымліваць, ды і на ферме яго падмяніць не знайшлі кім: ключы аддаў заатэхніку Міронаўне, але чакаць далей ужо не мог, бо на гэтай, так бы мовіць, небалючай балячцы пачалі з'яўляцца новыя, малюсенькія, як макавыя зярняткі, толькі белыя.

Цяпер хірург ужо не разважаў. Загадаў купіць шпрыц для абязбольваючага ўкола, бінт і тут жа ў паліклініцы хутка і акуратна выразаў балячку.

— Ну, што там? — з трывогай спытаў Васіль.

— Нічога страшнага, але, як і патрэбна ў такіх выпадках, пашлём на аналіз у горад Ліпск, бо ў нас рабіць такія аналізы няма магчымасці. Не перажывай. Дам табе бальнічны. Пакуль здымем швы, будзеш прыязджаць на перавязку.

Рана загойвалася хутка, не гнаілася, і Васіль, хоць і быў на бальнічным, не сядзеў ля плоту на лавачцы. Ён і салому прывёз, і атаву, што скасіў сусед, высушыў ды склаў на абмежку ў стажок. Адзіны яго сын Раман, што вучыўся ў горадзе ва універсітэце, сказаў, што на пару дзён адпросіцца з практыкі і сам усё зробіць, але бацька не дазволіў: вучоба ёсць вучоба, да яе трэба ставіцца сур'ёзна. Не такі ўжо ён хворы, каб самому не ўправіцца, тым больш, што сусед, добрая душа, заўсёды спяшаўся падставіць сваё плячо.

Загаілася рана, доктар зняў швы, і Васіль пачаў забывацца, што ў яго была тая балячка, як аднойчы акурат пасля абеду ў доме раздаўся тэлефонны званок.

— Гэта з раённай паліклінікі. Вам трэба тэрмінова прыехаць у анкалагічны кабінет. Прыйшлі з Ліпска вынікі аналізаў. Дрэнныя...

Васіля як хто абухом па галаве ўдарыў. Ён кінуў есці, бо ў той дзень Анюта запазнілася з абедам, і, пераапрануўшыся ва ўсё чыстае, пайшоў у калгасную кантору з надзеяй знайсці які транспарт, бо свае старэнькія "Жыгулі" былі ў рамонце.

Якраз у райцэнтр ад'язджаў старшыня, і праз паўгадзіны Асіпоўскі ўжо быў на месцы.

— Трэба вам пад'ехаць у анкалагічнае аддзяленне абласной бальніцы, — гледзячы ў нейкія паперы прамовіў яшчэ не стары, худы і пануры доктар-анколаг. — Я магу даць накіраванне хоць цяпер, але шкельца з матэрыялам, якое мы паслалі ў горад, знаходзіцца ў патолагаанатама. А ён ужо, напэўна, паехаў дадому. Так што прыходзьце заўтра, усё афармім, а ў панядзелак ранічкай і паедзеце. Заўтра ж пятніца, канец рабочага тыдня, які сэнс ехаць?

Васіль быў не з палахлівых, але на гэты раз сумненні моцна грызлі душу: пятніца, субота, нядзеля ў трывожным чаканні, у няведанні, што тут і як.

— Не, паеду заўтра, — сказаў ён цвёрда, а потым, падумаўшы, дадаў з кволай надзеяй на лепшае, на тое, што доктар неяк супакоіць.

— Няўжо тут можа быць нешта дрэннае? Рана зажыла, не баліць, не гнаіцца...

— Ну дык і што? — адарваў той галаву ад папер і паглядзеў на Васіля. — Усякае бывае. Можа, дзе адна ракавая клетачка засталася. А наогул, калі хочаш ведаць, бываюць і, так бы мовіць, метастазы без падстаў...

Асіпоўскі выйшаў з кабінета, як не сваімі нагамі. Сэрца яго калацілася. Яшчэ ўзнікла праблема, чым жа заўтра заехаць у вобласць, каб не спазніцца, бо аўтобус туды ішоў а шостай гадзіне раніцы, а яму ж трэба ўзяць накіраванне ды тое шкельца. Гэта будзе не раней як у дзевяць. А другі аўтобус толькі апоўдні. Трэба было наймаць машыну.

Вярнуўшыся дадому, ён пайшоў да аднаго прыватнага прадпрымальніка, што жыў у вёсцы і меў сваю "Аўдзі", і за пэўную плату дамовіўся аб паездцы.

Заўтра роўна ў дзевяць яны ўжо былі ў раённай паліклініцы. Анколаг выпісаў накіраванне, медсястра адшукала патолагаанатама, а той аглушыў другой навіной:

— Няма ў мяне шкельца. А дзе — не ведаю.

— То шукайце, званіце туды, куды пасылалі, можа дзе валялася.

Пакуль анколаг шукаў нумар тэлефона, пакуль дазваніўся, Васіль ледзь не самлеў. Шкельца было ў гарадской лабараторыі, і цяпер трэба было самому ехаць забіраць, а потым шыбаваць у абласны цэнтр. Вялікі круг, лішні бензін, лішнія грошы. І што, бадай, самае галоўнае — будзе страчаны час, і ён пры ўсім старанні ў пятніцу да абласнога анколага можа не трапіць.

Аднак паехалі. Забралі ў Ліпску шкельца і накіраваліся ў вобласць. Усю дарогу маўчалі. Вадзіцель спрабаваў пра нешта гаварыць, але Васіль не абазваўся, і той замоўк.

"Чаму ж я не ўзяў з сабой валідол, — са шкадаваннем думаў Асіпоўскі. — Так баліць сэрца, што ажно дыхаць цяжка".

Не спазніліся. Доктар якраз прыйшоў з абеду. Так ім паведамілі ў рэгістратуры, дзе на Васіля завялі картачку. Потым яны з вадзіцелем, які вырашыў не пакідаць земляка аднаго, падняліся на трэці паверх і знайшлі патрэбны кабінет. Спачатку шкельца ўзяў урач-гістолаг, каб самому зрабіць аналіз, не паверыўшы таму, папярэдняму, а потым трэба было ісці на прыём да хірурга-анколага.

Ля кабінета было чалавек шэсць. Усе сядзелі ў маўчанні. Здавалася, само паветра было напоўнена страхам і трывогай.

Дзверы кабінета адчыніліся, і ўрач-гістолаг спытаў:

— Хто тут Асіпоўскі?

Васіль як сядзеў, так раптам і абсунуўся на падлогу. Прыбеглі дактары, медсёстры, пачалі рабіць нейкія ўколы, прынеслі кіслародную падушку. Але нічога не дапамагло: Васіль ужо быў мёртвы.

— З ім прыехаў хто-небудзь? — спытаў урач-гістолаг, які трымаў у руках шкельца з так званым матэрыялам і нейкія паперы.

— Я, — абазваўся вадзіцель. Ён быў такі спалоханы і ўзрушаны, што не мог гаварыць.


— У яго не было ніякай злаякаснай пухліны, — сказаў урач і паволі пайшоў у свой кабінет...

На дворы стаяў апошні дзень лета...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

«АНТИУТОПИЯ-2016»

Сотвори свой мир сам



Каждый без исключения человек может написать один роман. О своей жизни. Вот мы с Андреем Климовым и пишем, сделав себя главными героями и соавторами одновременно. Тот самый Климов из первой нашей книги перешел во вторую — и такого натворил... А почему бы и нет, если "Минск-2016" — антиутопия, и речь в ней идет о событиях пусть недалекого, но все-таки будущего.

Да, во второй книге мы сделали Климова президентом (с намеком? — **Ред.**), "загнав" его в предполагаемые обстоятельства. И что вы думаете, очень серьезным властителем стал Андрей, вжился в эту роль и очень даже органично действует в этом виртуальном пространстве.

Наша книга — художественно-философское произведение, вымысел, сказка, но в ней намек, людям мыслящим урок.

Для чего мы все это сделали? Пытались найти формулу власти, понять, как Человек превращается в Дракона, как он действует и чем руководствуется на вершине пирамиды власти.

Глава из книги "Минск-2016", которая публикуется в "Народной воле", четвертая по счету и до нее уже произошло много событий: предвыборная кампания, день голосования, виртуальные встречи с Геннадием Карпенко, Юрием Захаренко, Димой Завадским, судьями и следователями зэка Климова, другими персонажами.

Глава "Знай наших" — о том, чего нет, но может случиться в будущем. Так авторы представляют ситуацию в стране и Минске, если к власти придет президент-реформатор".

Нас часто спрашивают, как мы пишем и кто главнее?

Евгений ОГУРЦОВ,
соавтор книги
"Антиутопия-2016".



Знай наших!

— Андрей, ты вчера так хорошо смотрелся на инаугурации в своем костюмчике от Версаче, а когда положил руку на Библию во время присяги, то показался таким величественным. И все наши стояли радостные, но уже в глазах читалось достоинство, а в осанке гордость. Да что там, ребята заслужили. Это момент истины, торжества справедливости, когда к власти, наконец-то, пришли умные и достойные люди. Уверен, что мы сделаем нашу страну классной, что о Беларуси заговорят, что народ, получив свободу, проявит свои лучшие человеческие качества. Как давно мы мечтали, еще в 95-м, когда со Шлындиковым создавали Гражданскую партию, что в стране будут созданы условия, когда творчество и инициатива — естественно, в рамках разума и культуры — станут главным движителем развития экономики и общества в целом. А кстати, тот шикарный Мерседес тебе, как главе государства, по наследству от Лукашенко достался?

— Еще чего! Во-первых, нельзя носить чужую одежду и пользоваться не своими вещами. С ними передается энергетика бывших хозяев. Я не хочу, чтобы на меня действовали флюиды Александра Григорьевича. А во-вторых, попридержим пока лукашенковский шестисотый, а через несколько лет продадим его на аукционе за приличные деньги, скажем, Бушу-младшему, вот и оправдаем затраты на наш бронированный лимузин. Нужно быть экономными, потому что денег нам потребуется на переустройство страны безумно много.

— Однако есть международный протокол и президент должен иметь борт № 1, то есть собственный самолет.

— Нам уже подарили боинг и даже успели покрасить в бело-красно-белые цвета, так что полетаем.

— Кстати, о загородном дворце Лукашенко...

— Все лучшее — детям!

— Сам-то где жить будешь, не на Жуковского же?

— Протокол не позволит, а так бы жил! Особнячок знаешь на Захарова, где Дом дружбы с зарубежными странами? Вот это строение и станет моей резиденцией. Здесь можно и друзей принять, да и официальных гостей тоже. Я житель городской и не хочу уезжать из него каждый день, тем более что это отнимает время, а нам надо работать. Кстати, парк Горького станет своеобразной зоной, где будут отдыхать от трудов праведных дипломаты, члены кабинета министров, то есть весь истеблишмент. Сделаем поляну для гольфа, другие развлекалочки. Тут и почетный караул будет официальных лиц приветствовать. Пора кончать с советскими привычками к монументализму, у нас страна маленькая, не тщится изобразить из себя гиганта, вот и будем жить по средствам.

— Не пугай меня, Андрей, неужто от резиденции на Карла Маркса, 38 откажешься?

— Да! Во-первых, такая громадина для администрации президента не нужна. Как минимум две трети сотрудников этого аппарата, а также все без исключения вертикальщики, эти взяточники, будут уволены. Нечего подменять собой правительство. Кстати, парламент тоже переедет в здание по улице Энгельса, хватит им! А на площади Ленина, которая снова станет "плошчай Незалежнасці", будут выселены из зданий все чиновничьи конторы, а здания отданы студентам. В бывшем Доме правительства будут работать факультеты БГУ, а в Овальном зале студенты юрфака будут слушать лекции по конституционному праву. Представляешь, с каким чувством будут входить будущие адвокаты, прокуроры, судьи в эту аудиторию? Как немцы в Рейхстаг после войны. А депутаты 13-го, разогнанного, Верховного Совета распишутся на одной из стен, возможно, так: "Падением диктаторского режима удовлетворен! Лидер фракции "Гражданское действие" Богданкевич". И вообще, эта площадь станет чисто студенческой: маленькие кафешки, библиотеки, баскетбольные площадки, интернет-клубы, дискотеки... Ну как Сорбонна в Париже или Оксфорд с Кембриджем в Англии. Кроме этого, мы из городов вынесем заводы и другие экологически вредные производства. Территории у нас достаточно, коммуникаций — тоже хватает. Будем осваивать страну, но уже осмысленно, по-хозяйски.

— В свое время, впрочем, очень похожее на наше, но не по форме, а по сути, в послевоенной Германии, в западной ее части, Эрхард и Аденауэр придумали модель социально ориентированного рынка по-немецки. Дали всем бездомным лопаты и кирки, а потом дешевые муниципальные квартиры, а потом дешевый народный автомобиль фольксваген по тысяче долларов за штуку. Очень быстро западные немцы стали жить хорошо и богато, тогда как их родственники в восточном секторе сорок лет героически строили счастливое будущее, да так и не достроили. Надо полагать, лавры немцев не дают тебе покоя?

— Фигня все это. Главное, что действительно одним из первых проектов станет автомобиль. Дешевенький, простенький, доступный любой семье. Но не для того, чтобы по городу на нем гонять да пробки создавать, а чтобы семья домой, в свой загородный коттедж уехать смогла да утром до работы добраться. Вот тут-то и станет проблема дорог. Будет брошен клич: "Все на борьбу с бездорожьем и разгильдяйством!" Будем строить хорошие дороги, даже очень хорошие, и торг здесь не уместен. Уже сейчас солидные европейские дорожные фирмы готовы побороться за тендер на этот заказ. Условия будем диктовать мы.

— Вот уж кто-то погреет руки!

— Обрубим ручонки-то! Да, власть должна быть богатой, но не воровскими методами, не грабежом народа, чтобы у одних отнять, а другим, то есть своим, дать. Население должно не бедствовать, а богатеть. На месте нерентабельных заводов, которые просто сжигают энергию и расходуют дорогое сырье, а производят никому не нужное дерьмо, будут разбиты сады и парки, где будут гулять дети и щебетать птички. Источники уничтожения экологии станут производителями кислорода и хорошего настроения.

— Твой второй роддом, где явился миру Климов-мыслитель, то есть СИЗО № 1, ты увековечишь в веках?

— Снесу к бениной матери, чтобы и камешка не осталось. К этому зданию у меня особые счеты. Пусть на этом месте храм будет воздвигнут. Тут сидели разные люди: и невинные агнцы, и хищные волки, и католики, и православные, и мусульмане, и буддисты, и иудеи... Пусть здесь будет собор всех конфессий, эдакая мини-церковь единой веры в справедливость Божью.

— Ну, ты просто миротворец, Андрей, да и только. Я думал, ты шутишь, когда говорил, что на должность президента национального олимпийского комитета... Александра Лукашенко выдвигаешь.

— Никаких шуток. У нас не так много сильных личностей, чтобы ими бросаться. А бывший президент Беларуси человек, безусловно, сильный, да к тому же спорт любит фанатично. Вот пусть его в стране и развивает. Тут у нас много вопросов и нерешенных проблем. К тому же всегда под надзором и при деле, поэтому некогда ему будет всякими глупостями заниматься. К тому же скажу, что два сына Лукашенко уже у меня работают, так что варианта Ирака не будет, когда всю семью Хусейна замочили. Хорошие, кстати, ребята, эти братья Лукашенко...

— Себе соломку стелешь на будущее, когда придется приставку "экс" примерять, посему бывшего президента на почетную должность определяешь?

— Не надо, Лукашенко был не самым сильным политиком. Ему не хватило уверенности в себе и легитимности как правителю. Он осознавал себя всегда неким самозванцем, не природным властителем. Поэтому выпячивался, надувал щеки, стремился во всем быть выше всех. Выкашивал вокруг себя умных, талантливых, энергичных помощников, чтобы они, не дай Бог, его самого не затмили. Вот и остался, в конце концов, с маленькими и серенькими подельниками, которые усилить его собственный интеллект не могли, и он проиграл. Теперь в отсидку эти фунќи и пойдут, знали, что творили.

(Окончание на 4-й стр.)

Дэпутаты ПАСЕ сустрэліся з ліцэістамі

Днямі ў Мінску адбылася сустрэча дэпутатаў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) з калектывам афіцыйна зачыненага Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа.

Кансультацыйныя заняткі, якія праводзяцца з вучнямі ліцэя ў розных памяшканнях беларускай сталіцы, наведалі старшыня падкамісіі ПАСЕ па Беларусі Ёнас Чэкуоліс і палітычны сакратар ПАСЕ Рудзігер Басоў. "Яны правялі гутаркі з ліцэістамі і іх бацькамі, азнаёміліся з праблемамі калектыву навучальнай установы і паабяцалі паведаміць атрыманую інфармацыю парламентарыям у Страсбургу, а таксама аказаць садзейнічанне ў вырашэнні праблем, з якімі сутыкнуўся калектыў ліцэя", — адзначыў Уладзімір Колас.



Дэпутаты ПАСЕ падчас візіту ў Беларусь.

Сярод узнятых пытанняў — матэрыяльная падтрымка дзейнасці ліцэістаў, уключаючы арэнду памяшканняў і набыццё навучальна-наглядных дапаможнікаў, тэхнічных сродкаў навучання і класнага абсталявання, прызнанне ў Еўропе ліцэйскіх атэстатаў аб сярэдняй адукацыі, прызначэнне імянных стыпендый, маральная і інфармацыйная падтрымка пазіцый калектыву ліцэістаў, іх бацькоў і выкладчыкаў дэмакратычнай еўрапейскай супольнасцю.

Марат ГАРАВЫ.

ВЫСТАВА

«Мэрылін Манро» ў Мінску

У сталічным Палацы мастацтва адкрылася фотавыстава "Мэрылін Манро", у якой прадстаўлена каля 300 унікальных фатаграфій з выявай вядомай актрысы на здымках, у жыцці, а таксама кадры фотасесій. Арганізатары выставы — тэатральны праект "Віртуозы сцэны" і маскоўская галерэя "Дом на Шчокіна".

Як паведаміў БелаПАН дырэктар тэатральнага праекта "Віртуозы сцэны" Уладзімір Ушакоў, ідэя арганізаваць выставу фатаграфій Мэрылін Манро ўзнікла пасля наведвання ім падобнай экспазіцыі ў Маскве. "Я хацеў, каб мара ўбачыць самую прыгожую жанчыну XX стагоддзя ажыццявілася не толькі для мяне, але і для ўсіх жыхароў Беларусі, — сказаў У.Ушакоў. — Спадзяюся, што пасля беларускай сталіцы выстава аб'едзе ўсе абласныя цэнтры краіны".

Паводле яго слоў, выставу вылучае тое, што, акрамя фотаздымкаў, на ёй сабрана шмат інфармацыі пра лёс актрысы, якая ідзе не як анатацыя да партрэтаў, а як невялікія мастацкія творы.

Выстава працягнецца да 20 кастрычніка.

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

Знай наших!

(Окончание. Начало на 4-й стр.)

— Ну, ты-то мудрее поступаешь, самых крутых бизнесменов, самых сильных экономистов, ученых и управленцев себе в команду набираешь. По составу твоя команда не слабее путинской будет. Только вот я сомневаюсь, что такой звездный состав долго протянет. У тебя, Климов, наполеоновские замашки прослеживаются...

— О чем ты говоришь! Если и будет у нас диктатура, то только диктатура интеллекта. У власти будут просто умные люди, которые сумели подняться над людскими пороками: жадностью, трусостью, завистью. Самый веский аргумент для принятия решений — благополучие гражданина и страны.

— Андрей, ты хоть осознаешь, что мы сегодня получили? Это же необъятная власть! Свихнуться с ума можно! Сделать все, что хочется, да на это 24-х часов в сутки не хватит.

— Успокойся и расслабься. Есть кабинет министров — вот пусть и работает, а мы будем наблюдать за ситуацией, и, если надо, корректировать и направлять. Картошкой и морковкой, кипящими в котле каждодневных проблем и обстоятельств, мы не будем. Помешивать поварешкой и подсыпать по вкусу соль и перец — это наше, но не более. Пойми, президент — это шеф-повар или, если хочешь, дегустатор политики государства, но с правом вылить стряпню правительства в унитаз.

— Ну что, праздник по поводу твоего избрания закатывать будем? Пива выкатим народу, напьются все от души, подерутся, поскандалят, фейерверк посмотрят, подъезды в центре города все до одного замочат и...

— Никаких массовок в городе! Семьями и коллективами на природу, на пикники, на рыбалку! Там есть реки, озера, кустики, наконец... Все достойно, цивилизованно, а главное, приятно и полезно.

— Скажу честно, народ балдел, когда увидел, что машина президента вместе со всеми ехала по проспекту, останавливаясь на красный свет, и водители рядом стоящих машин брали под козырек и махали вам руками. Это что, пиар-акция, набор популярности?

— Так будет всегда. Что толку перекрывать плохие дороги, чтобы быстрее доехать самому. Надо строить качественные, широкие магистрали с хорошей системой регулирования, тогда и ты, и другие ехать будут быстро, никто проблем знать не будет.

— Кстати о дорогах. На Западе столько видеокамер и другой техники вдоль дорог понаставили, что нарушать правило никто не рискует. А у нас гаишник за дерево станет, свою сотню баксов с водителей стрясет, и дела ему до этой самой безопасности движения нет никакого; иначе бы, как пень посреди дороги, стоял да предотвращал нарушения, а не фиксировал их.

— Хорошая идея. Ею стоит воспользоваться. Во-первых, численность милиции сократим, во-вторых, дадим работу мозгам наших ученых, пусть нечто дешевое и качественное придумают. Да и не только на дорогах, в подъездах свой "глаз" иметь тоже совсем не плохо. Безопасность...

— Ага, безопасность, говоришь? Коль твоя резиденция будет рядышком с парком и набережной Свислочи, то кроссы бегать тебе там и придется. А не боишься?

— Чего это мне бояться?

— Ну, на первый момент — собак. Знаешь, сколько их в этих местах? Сотен пять или десять, не меньше! Но не думай, что это болонки и пудели. Все больше питбультерьеры, которых везде, кроме как у нас, запретили даже выводить на улицу, ротвеллеры — неуправляемые злобные собаки, доберманы, овчарки и прочая гавкающая и кусающая братия. Старичок некий трусит по парку, а из-за куста "друг человека" как прыгнет ему на спину, так у ветерана тут же инфаркт. А у детей такие стрессы все больше заиканием заканчиваются да сорока уколами от бешенства. Хозяин же пса в лучшем случае заплатит штраф.

— Люди платят за собак налоги. Если их не хватает, то будут платить больше, но в парках, скверах, на стадионах и на детских площадках собак больше не будет! Там будут отдыхать люди, причем безопасно. А если когда-нибудь собака укусит ребенка или испугает старика, то хозяин будет сидеть в тюрьме, как если бы он применил против человека холодное оружие. Кстати, в президентском парке будут спокойно бегать все желающие. Там будет центр спорта и отдыха.

— Красиво говоришь! Но все-таки я тебе очень поучительную сказочку расскажу. Жил-был в одной стране властитель дракон, и очень уж он угнетал людей. Там же проживал и очень добрый благородный юноша, который ненавидел тиранию и любил свободу. Вот он и пошел воевать с драконом, но прежде встретил мудрого старика, который, кроме того, что дал ему волшебный меч-кладенец, еще и слоган волшебный ему сообщил, который звучит так: "Дракон везде. Смотри вокруг, смотри в себя, и ты его увидишь!".

Вооруженный словом и сталью, юноша пошел сражаться и победил дракона.

И потом дворец стал осматривать, что где лежит. И такое увидел: горы золота, драгоценные камни, восхитительные, необыкновенной красоты девушки... Захотелось юноше все это иметь, и стали отрастать у него драконьи когти, чешуя, зубы... Но вспомнил он мудрые слова старика: "Смотри вокруг, смотри в себя, и ты дракона этого увидишь!" Понял мальчик смысл этой мудрости, и снова стал Человеком и осчастливил свою страну разумным правлением. Как тебе сказочка?

— Ты что, меня в диктаторских устремлениях подозреваешь?

— Нет, но всякая власть заразна, ох заразна!

— Наша задача исполнить обещания, которые были даны народу. Исполним — нас попросят работать дальше. Не исполним — нас попросят освободить кресло. Только и всего. Вот тебе формула власти от Климова.

— Формула-то хороша, но где возьмешь деньги на столь широкие реформы?

— Год-два свободы, но полной свободы бизнеса, без ограничений — и ты не узнаешь страну. Если соединить наш научный потенциал с возможностями предприимчивых людей под опекой государства, то это будет прорыв на все рынки и ко всем самым передовым технологиям. К тому же, когда стало ясно, что режим Лукашенко падает, инвесторы хлынули в нашу страну.

— Надо полагать, что первый официальный визит президента Климова будет в Чехию к своему другу президенту Свободе?

— Это удивительная страна и прекрасные люди. Да, Свобода приезжал ко мне в тюрьму и поддерживал меня всегда. Он мой друг и им останется. С Чехией будем дружить и учиться у них демократии, цивилизованному рынку и гражданскому обществу. Во всяком случае, до откровенной лжи наша власть не опустится. Что за радость носить титул чемпиона, если ты его не выиграл. Это все равно как чужую медаль или погоны нацепить.

— Завтра ты должен дать народу тезис твоего правления. Он у тебя готов?

— Сформулируешь ты, а смысл такой: надо поздравить народ с окончанием коммунистического рая Ленина, Сталина, Брежнева и местечкового вождя Лукашенко. Поздравить всех, что сегодня мы проснулись в Европе. Поблагодарить пенсионеров за то, что они дожили до нашей победы. Наверно, предостеречь всех от выяснения отношений и охоты на ведьм. Сказать, что я не только гарант Конституции, но и гарант свободного предпринимательства и личный телохранитель каждого честного бизнесмена. Объявить, что новая власть — это гарант общества широких возможностей, трезвой жизни и политики...

— Короче, так: работа, благоденствие и трезвость!

ХАКЕЙ

«Нёман» — аднаасобны лідэр

На чэмпіянаце Беларусі па хакеі з шайбай адбыліся чарговыя сустрэчы. Чакалася, што самым цікавым матчам стане супрацьстаянне мінскага "Дынама" і гродзенскага "Нёмана" — каманд, якія не згубілі да асабістай сустрэчы ніводнага ачка. У напружанай сустрэчы гродзенцы выйгралі ў мінчан з лікам 2:0, дакладна паўтарыўшы вынік мінулага тура, у якім гродзенцы выйгралі ў сталічнага "Юнацтва".

Сярэбраны прызёр мінулагодняга першынства краіны сталічны "Керамін" разграміў у гасцях магілёўскае "Хімвалакно" з лікам 8:1, а "Гомель" з буйным лікам перамог хакеістаў "Віцебска" — 7:2.

Сталічнае "Юнацтва" было мацнейшым у супрацьстаянні з хакейным клубам "Брэст" — 2:1.

Пасля чатырох праведзеных сустрэч аднаасобнае лідэрства ўтрымлівае гродзенскі "Нёман". У гэтай каманды 12 набраных ачкоў. Яшчэ чатыры клубы пасля чатырох гульняў маюць па 9 ачкоў.

Наступныя сустрэчы чэмпіянату Беларусі адбудуцца 20—21 верасня. 20-га згуляюць "Віцебск" і наваполацкі "Хімік", а таксама "Юніёр" і "Брэст". А 21-га на лёд выйдуць "Дынама" і "Юнацтва".

Бліжэйшыя сустрэчы чэмпіянату ўсходнееўрапейскай хакейнай лігі запланаваны таксама на 20—21 верасня. Тут "Керамін" прыме латвійскі "Металургс", "Рыга-2000" згуляе з "Гомелем", "Хімвалакно" — з расійскім "Тытанам", а кіеўскі "Сокал" — з "Нёманам".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЗАПРАШЭННЕ

У Мінску — новы кінасезон

Новы сезон унітарнае прадпрыемства "Кінавідэапракат" Мінгарвыканкама пачынае з вялізнай праграмы кінафільмаў.

Як паведаміў БелаПАН генеральны дырэктар прадпрыемства Васіль Коктыш, у кінаафішы прадстаўлены вельмі розныя карціны. Напрыклад, стужка **"Цыпачка"**, паводле яго слоў, знятая на мяжы пашлаватага маладзёжнага слэнга, а фільм **"Спадарыня пакаёўка"** — сучасная казка пра Папялушку. В.Коктыш таксама адзначыў дзве новыя карціны маладзёжнай тэматыкі: лёгкі непатрабавальны фільм **"Маладажоны"** і карціну высокага ўзроўню **"Як адчапіцца ад хлопца за дзесяць дзён"**, што заслужыў павагу крытыкаў.

Паводле прагнозаў генеральнага дырэктара, самым наведваемым фільмам абяцае стаць стужка **"Піраты Карыбскага мора"** з удзелам вядомага акцёра Джоні Дэпа. "Будзе масіраваны паказ фільма, — сказаў В.Коктыш. — Мы стартуем трыма копіямі, але тэрміны пракату стужкі абмежаваныя: яе будуць дэманстраваць толькі на працягу чатырох тыдняў, пачынаючы з 29 верасня".

Да канца года ў кінатэатрах горада Мінска плануецца паказваць фільмы, якія, паводле слоў Коктыша, "збіраюць у пракаце каля 200 млн. долараў і больш у ЗША і Канадзе". Сярод такіх стужак — **"Ліга выдатных джэнтльменаў"**, **"Гаспадар мораў"**, што стартуюць 1 снежня паралельна з сусветным пракатам, і іншыя. У кастрычніку пачынаецца пракат апошняй карціны Ларса фон Трыера **"Дагвіль"** і шмат іншых фільмаў. А ў лістападзе мінчане ўбачаць карціну — пераможцу Венецыянскага фестывалю **"Вяртанне"** расійскага рэжысёра Андрэя Звягінцава. Адметна, што карціна выйдзе ў беларускім пракаце раней, чым у Расіі.


Паводле слоў генеральнага дырэктара "Кінавідэапракату", праграма расійскага кіно, якая будзе дэманстравацца ў Цэнтры расійскай кінематаграфіі на базе кінатэатра "Цэнтральны", а таксама іншых кінатэатраў, таксама абяцае стаць разнастайнай. У планах — дэманстрацыя новых і найбольш цікавых расійскіх карцін, такіх як **"Благаславіце жанчыну"**, **"Прагулка"**, **"Кактэбель"** і іншых.

Што датычыцца дзіцячага кіно, дык, паводле слоў В.Коктыша, "закуплена вельмі шмат карцін", у тым ліку касавы амерыканскі фільм **"У пошуках Нема"**. "Свайго роду адкрыццём стане фільм **"Дзеці шпіёнаў-3"**, — сказаў ён. — Упершыню гэты фільм запісаны ў новым фармаце "Тры Дэ", што дазваляе глядзець яго ў любым кінатэатры праз стэрэаакуляры. Дарэчы, стэрэакіно, якое мы паказваем ў кінатэатры "Мір", — гэта ўжо ўчарашні дзень, сёння ў гэтым фармаце стужкі не запісваюць, хаця яны і запатрабаваны нашымі гледачамі".

Закрануў Васіль Коктыш і лёс беларускай карціны **"Анастасія Слуцкая"**. Паводле яго слоў, фільм зараз займае 15-е месца па зборах з усіх карцін "асноўнага рэпертуару". "Стужку ўжо паглядзелі 26 тысяч гледачоў, што з'яўляецца вельмі добрым паказчыкам", — сказаў генеральны дырэктар "Кінавідэапракату".

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

Чайнворд



1.Скатерть. 2.Перочинный ножик. 3.Лютик. 4.Целина. 5.Верхняя часть бедра. 6.Сирень. 7.Нутряное свиное сало. 8.Водосток. 9.Глыба. 10.Облик, лицо. 11.Осколок, щепка. 12.Дымоход. 13.Заготовитель. 14.Кисть (украшение). 15.Амбар. 16.Племянник (обл.). 17.Крупнозернистый желтый песок. 18.Даль. 19.Шишка, желвак. 20.Союз (грам.). 21.Арника (бот.) 22.Кадка с крышкой. 23.Ростовщик. 24.Рассмотрение. 25.Крупная дробь. 26.Можжевельник. 27.Удила. 28.Порыв. 29.Штукатур. 30.Ломтик. 31.Настурция. 32.Беседка. 33.Управляющий имением. 34.Мот. 35.Сверчок. 36.Младенец. 37.Шелк (уст. и поэт.). 38.Шут, клоун. 39.Недостаток. 40.Прихожанин. 41.Очерк. 42.Трясогузка. 43.Обманщик. 44.Ушат. 45.Четки. 46.Льномялка. 47.Свиристель. 48.Истопник. 49.Ковер. 50.Бечевка (разг.). 51.Зачинатель. 52.Монастырь. 53.Опара. 54.Воззвание. 55.Подстожье. 56.Летучая мышь. 57.Нашествие. 58.Обязанность. 59.Фитиль. 60.Дерганье, возня. 61.Рассказчик. 62.Бричка. 63.Каблук. 64.Тележник. 65.Выхухоль. 66.Невестка. 67.Алоэ. 68.Сросток. 69.Шурин. 70.Снаряжение. 71.Клест. 72.Грязь. 73.Репей. 74.Мера в ширину ладони. 75.Взятка. 76.Скрип. 77.Принуждение. 78.Сладость. 79.Подберезовик (обл.). 80.Руководитель. 81.Восклицательный знак. 82.Кленовый сок. 83.Пробка. 84.Смета. 85.Нищий. 86.Парикмахер. 87.Тмин. 88.Небытие. 89.Подорожник. 90.Каратель. 91.Крест. 92.Грусть.

Адказы на крыжаванку, надрукаваную ў №172

Па гарызанталі: 2.Смак. 7.Шляга. 12.Выпаратак. 13.Сайра. 14.Арап. 15.Сліна. 16.Недавокіс. 18.Плата. 19.Атон. 20.Скаба. 23.Айбек. 24.Скамароства. 25.Ікаўка. 26.Азарт. 29.Акант. 32.Раб. 33.Пал. 34.Абака. 36.Уяр. 37.Тупат. 38.Ар. 40.Асака. 41.Нінбо. 44.Наіна. 45.Нікан. 46.Цахур. 47.Ежа.

Па вертыкалі: 1.Свёнтак. 2.Спадоба. 3.Мара. 4.Аравакі. 5.Капот. 6.Камін. 8.Лялька. 9.Ганьба. 10.Падлісак. 11.Кратавіна. 17.Кома. 20.Сказ. 21.Амур. 22.Арт ... 24.Скасаванне. 27.Аматарка. 28.Трапанне. 29.Абутніца. 30.Апранаха. 31.Тля. 35.Кук. 39.РБ. 42.Іна. 43.Охра.

На шахматнай дошцы: 1.Пісарчук. 2.Аір. 3.Нататка. 4."Ан". 5.Сун. 6."Таск". 7.Аз. 8.Закраса. 9.Печка. 10.Аса. 11.Скатка. 12.Нектар. 13.Пакт.

Задача: 1.пр.а5 пр.: g5 2.пр.: c7 пр.: b6 3.п. a5 пр. f4 A 4.пр. g3 пр.: h2 5.Д g1x. A 3... пр. h4 4.пр. g3x.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ

Александра Герасименя, Наталья Цилинская и Геннадий Тумилович снимаются в клипе

*Группа "Крамбамбуля" начала работу над съемками клипа на песню "Госці" из альбома "Каралі раёна", записанного вместе с **Сергеем Михалком** ("Ляпис Трубецкой") и **Александром Куллинковичем** ("Нейро Дюбель").*

Режиссерами ролика стали **Алексей Хацкевич** и **Матвей Сабуров,** хорошо известные по клипам "Ляписа Трубецкого". Одна из их последних работ — видеовоплощение песни "Ляписа Трубецкого" "Ласточки".

Главными действующими лицами клипа стали не только Михалок и Вольский (на фото), но и известные белорусские спортсмены, исполняющие роли зарубежных гостей, о которых поется в композиции: пловчиха **Александра Герасименя,** пятикратная чемпионка мира велосипедистка **Наталья Цилинская,** футболисты **Геннадий Тумилович, Александр Глеб** и **Александр Хацкевич.**

"Пригласить на съемки спортсменов предложили друзья из одной столичной спортивной газеты, — говорит один из режиссеров клипа Матвей Сабуров. — *Как ни удивительно, все они согласились на это без каких-либо дополнительных условий, за что им большое спасибо".*

Надо отметить, что съемки были несколько нестандартными для клипа — всех героев просто много раз сфотографировали, для того чтобы затем совместить их лица с рисованными фигурами. В анимационной реальности и будут разворачиваться основные события, которые время от времени будут прерываться съемками различных картин природы Беларуси.

"Насколько я понял из сценария, это будет такой лубочный постмодернизм", — отметил **Левон Вольский.**

Ожидается, что клип появится на экранах в начале октября.

А 12 октября в концертном зале "Минск" состоится сольный концерт "Крамбамбули" с программой "Каралі раёна". Это будет редкая и, возможно, единственная возможность увидеть на одной сцене всех создателей альбома, включая **Александра Куллинковича** и **Сергея Михалка.** Именно там лидеры "Крамбамбули", "Ляписа Трубецкого" и "Нейро Дюбеля" впервые исполнят на белорусском языке свою версию композиции *"Belle"* из мюзикла *"Нотр-Дам де Пари".*

Дмитрий БЕЗКОРОВАЙНЫЙ.

Об объявлении умершим

В суд Ленинского района г.Гродно поступило заявление об объявлении умершим гражданина **Владимира Максимовича БУДЯНУ**, 19 декабря 1966 года рождения, уроженца Республики Молдова, села Малые Мелешты Яловеньского района, проживающего ранее: Республика Беларусь, г.Гродно, ул.Пушкина, д.32, кв.58.

19
верасня

ПЯТНІЦА
Усх. 6.50 Зах. 19.15
Даўж. дня 12.25
Апошняя квадра
18 верасня

Сёлета спаўняецца **535 гадоў** з часу першых летапісных звестак (1468) пра г. Астравец

Пятница, 19 сентября

БТ

07.00, 09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Новости.
07.10 "Не в шляпе счастье". Мультфильм.
07.30 "Дом посреди грозы". Комедийная мелодрама. (Международный Французский Канал).
09.10 "Пси-фактор". Научно-фантастический сериал. (США-Канада).
10.00 Сад мечты. Передача для дачников.
10.25 "На перекрестках Европы". Национальный телефестиваль песни.
10.50 "Приют муз". Видеофильм. ("Телефильм").
11.10 "Королева сердец". Сериал. (Колумбия — Венесуэла).
12.15 Комедия **"Соломенная шляпка".** ("Ленфильм"). 2-я серия.
13.20 Триллер **"Беги, Лола, беги!".** (Германия).
14.40 "Москва — Минск".
15.15 "Песенка радости". Мультфильм.
15.35 "Дом посреди грозы". Комедийная мелодрама. (Международный Французский Канал).
17.10 "Пси-фактор". Научно-фантастический сериал. (США-Канада).
18.10 Комедия **"Соломенная шляпка".** ("Ленфильм"). 2-я серия.
19.10 Рыцарский боевик **"Принц Велиент".** (Ирландия-Германия-Великобритания).
20.45 Колыбельная.
21.00 Панорама. Информационный канал.
21.45 Новости региона.
21.55 "Королева сердец". Сериал. (Колумбия — Венесуэла). Заключительная серия.
22.45 Школа злословия.
23.15 Триллер **"Обитель зла".** (Германия-Великобритания).

ОНТ

08.00, 09.00, 18.00, 20.30, 23.25 Наши новости.
08.05 Телеканал "Доброе утро".
09.05 "Земля любви, земля надежды". Сериал. 140-я серия.
09.50 Сериал **"Две судьбы".** 12-я серия.
10.45 Дисней-клуб: "Базз и его команда" до 11.10.
15.00 "Город женщин". Телевизионное шоу.
15.45 "Фабрика звезд-3".
16.10 Премьера сериала **"Берег мечты".** 15-я серия.
17.00 "Большая стирка" с Андреем Малаховым.
18.10 "Новый день". "Дэвид Копперфилд. Разоблаченная иллюзия".
18.35 "Шутка за шуткой". Юмористическая программа.
19.05 "Земля любви, земля надежды". Сериал. 140-я серия.
20.00 Время.
21.00 "Поле чудес" с Леонидом Якубовичем.
22.05 "Фабрика звезд-3".
23.40 Комедия **"Мужчина по вызову".** (США).

РОССИЯ

07.45 Сериал **"Каменская-2. Мужские игры".** 4-я серия.
08.50 Комната смеха.
09.50 Вести. Дежурная часть.
10.00, 19.00 Вести.
18.00 Аншлаг.
19.30 Местное время. Вести-Москва.
19.50 Спокойной ночи, малыши!
19.55 Народный артист.
20.50 "Бабы, вперед!" Концерт Елены Степаненко.

КУЛЬТУРА

15.00 "Плоды просвещения". "Беседы о русской культуре". Авторская программа Ю.Лотмана. Передача 15-я.
15.50 Ж.Б.Мольер. "Тартюф". Телеверсия спектакля театрального центра "Вишневый сад". Постановка А.Вилькина.
17.30 Новости культуры.
17.45 "К Франкфуртской книжной ярмарке". Александр Солженицын.
17.55 Басы XXI века.
18.35 "Без свидетелей". Худ.фильм. ("Мосфильм", 1983). Режиссер Н.Михалков.
20.05 Блеф-клуб.
20.45 "Записки дипломата". Анатолий Адамишин. Док.сериал. Фильм 4-й. "Снова в Италии".
21.15 "Линия жизни". Вячеслав Полунин.
22.05 "Олимпия. Шок обнаженной натуры". Док.фильм. (США).
23.00 Новости культуры с Владиславом Флярковским.
23.25 "Кто там..." Авторская программа В.Верника.

НТВ

09.00 Сегодня утром.
09.20 Погода на завтра.
09.25 "Без рецепта". Доктор Бранд.
10.05 Фактор страха.
11.00 "Сегодня" с Кириллом Поздняковым.
14.35 "Люблю животных больше, чем людей. "Ток-шоу "Принцип домино".
16.00 "Сегодня" с Кириллом Поздняковым.
16.30 Сериал **"Супершпионки".** (США).
17.25 Национальная безопасность: гибель эскадры.
18.00 "Сегодня" с Татьяной Митковой.
18.35 "Свобода слова" с Савиком Шустером.
19.55 Приключенческий боевик **"Инферно".** (США).
21.50 Супербокс: Анхель Манфриди против Вилсона Родригеса.

СТВ+RenTV

06.20, 15.25 "Пауэр рейнджерс, или Могучие рейнджеры". Телесериал.
06.45 "Гаджет и Гаджетины". Мультсериал.
07.10 "Лесные прятки". Док.фильм.
07.20 "Минщина. Люди, события, факты".
07.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.35 "24 часа".
07.50 "СТВ-спорт".
08.00 "Минск и минчане".
08.10 "Технология".
08.20 Мелодрама **"Конец романа".** (США).
10.10 "Автопанорама".
10.25 "Театральные истории".
10.40 "Большой взрыв". Док.фильм. 2 часть.
11.30 "Удивительные животные". Док.фильм.
12.00 "Истинная любовь". Теленовелла.
12.55 "Мировые розыгрыши".
13.50, 18.40 "Крутой Уокер". Телесериал.
15.00 "Супершоу братьев Марио". Мультсериал.
16.15 Приключенческий фильм **"Адъютант Его Превосходительства".** 5-я серия.
17.55 "Минщина. Люди, события, факты".
18.05 "Филармоническая неделя".
18.10 "Светская хроника".
18.20 "Минск и минчане".
18.25 "Тема дня".
19.55 "СТВ-спорт".
20.05 "Реактивный бокс".
20.20 Детский экран. "Добрый вечер, малыш...".
20.35 "Автопанорама".
20.50 Криминальная комедия **"Марихуана".** (США).
22.55 "Технология".
23.05 "Новости СНГ".
23.25 Драма **"Мэри Рейли".** (США).

8-Й КАНАЛ

17.30 "Мульт-парад" от "Бюргера".
17.50 Телемагазин.
18.00 Триллер **"Увлечение".**
19.30 Док.сериал "Трюкачи Голливуда".
19.50 К-видео "Топ-8".
20.00 Сериал **"Таинственный мир Рут Рендел".**
20.45 "Вечарніца".
21.00 Телемагазин.
21.10 Худ.фильм **"Чужой-4".**

ТВ ЦЕНТР

04.45 Информационно-развлекательный канал "Настроение".
07.40 Газетный дождь.
07.50 Смотрите на канале.
07.55 "Мелодрама с покушением на убийство". Худ.фильм.
09.10 Наш сад.
09.25 Караоке стрит.
09.40 Телемагазин.
10.00, 13.00, 17.00, 21.00 События. Время московское.
10.15 Телеканал "Дата".
11.15 Отдел "Х".
11.55 Денежный вопрос.
12.10 Петровка, 38.
12.30 Деловая Москва.
13.15 "Инспектор Кестер". Детективный сериал. (Германия).
14.20 Войди в свой дом.
14.30 "Неприрученная Африка". Телесериал. (Великобритания).
15.00 Регионы: прямая речь.
15.30 Каля-маля.
16.00 "Цыганская любовь". Телесериал. (Мексика).
17.15 "Алфавит". Телеигра.
17.55 "Загадочная женщина". Телесериал. (Венесуэла).
18.50 Пять минут деловой Москвы.
19.00 Комедия **"Иван Бровкин на целине".**
21.40 Русский век.
22.20 Времечко.
22.50 Петровка, 38.
23.10 25-й час. События. Время московское.
23.30 — 01.05 "Час теней". Худ.фильм. (США).

EUROSPORT

09.30 Конный спорт. Кубок наций. Повтор.
10.30 Пляжный волейбол. Мировое турне. Мужчины. Испания. Повтор.
11.30 Спидвей. Кубок мира. Финал. Дания. Повтор.
12.30 Легкая атлетика. Лучшее 2003 года. Тележурнал. Повтор.
14.30 Велоспорт. Тур Испании. 12-й этап. Повтор.
15.30 Велоспорт. Тур Испании. Гонка с раздельного старта. Прямая трансляция.
18.15 Теннис. WTA. Шанхай.
19.15 Мото гран-при. Рио-де-Жанейро. Прямая трансляция.
22.15 "Самый сильный человек". Тележурнал.
00.30 Ралли рейд.
01.00 "Формула". Автожурнал.
01.15 "Феррари". Автожурнал.
01.45 "Спортивные автомобили". Автожурнал.
02.00 Экстремальные виды спорта. Повтор.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэдактар нумара Марыя ЭЙСМАНТ

Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №448 ад 15 мая 2000 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на УП "Красная звезда", 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 29 270 экз. Заказ № 800.